ЗЬВАЗДА

№ 273 (3381) Субота 30 лістапада 1929 г.

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў Камуністычнай Партыі (б) Беларусі

Адрас рэд. і канторы: Менск, Савецкая, 63
ШТОДЗЕННАЯ ГАЗЭТА, ГОД ВЫДАНЬНЯ XIII
Тэлефоны: рэдактар—1074, сакратар—619, кантора—731

ІНТЭРВЕНЦЫЯНІСТЫ ГАТУЮЦЬ НОВЫЯ СЬМЕРЦІ ДЛЯ БАРАЦЬБЫ З СССР

ТОКІЁ, 28. Паводле вестак з Харбіну, Цыцыкарскі дубань Ван Фу-лін сьпешна фармуе „батальёны сьмерці" пры ўдзеле рускіх белагвардзейцаў.

БАБРУЙСК. (Наш кар.). 26 лістапада закрылася акруговая канфэрэнцыя ўдарных брыгад Бабруйшчыны. На канфэрэнцыі прысутнічала 90 ўдарнікаў, з іх 10 рабочых саўгасаў. На канфэрэнцыі адзначана, што найбольшыя дасягненьні па сацыялістычным спаборніцтве маюць гута «Комінтэрн», лесазавод № 6 і саўгас Рачкавічы. На канфэрэнцыі вусім адсутнічалі гаспадарнікі.

Прывітаньне менскім ударнікам!

„ТОЛЬКІ ПРАЦОЎНЫ ЎЗДЫМ І ПРАЦОЎНЫ ЭНТУЗІЯЗМ МІЛЬЁННЫХ МАС МОЖА ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ТОЙ ПАСТУПАЛЬНЫ РОСТ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ ПРАЦЫ, БЕЗ ЯКОГА НЕМАГЧЫМА КАНЧАТКОВАЯ ПЕРАМОГА САЦЫЯЛІЗМУ НАД КАПІТАЛІЗМАМ"

(І. СТАЛІН)

ЗАБЯСЬПЕЧЫМ ДАПАМОГУ І КІРАЎНІЦТВА ЎДАРНЫМ БРЫГАДАМ

Падагульваючы вынікі мінулага году, т. Сталін у артыкуле «Год вялікага пералому» адзначаў, што буйнейшым і важнейшым нашым дасягненьнем зьяўляецца пад'ём творчай актыўнасьці мас.

Сацыялістычнае спаборніцтва, якое ўзьнікла па ініцыятыве мас, ахапіла амаль усе прадпрыемствы Саюзу. Пачаўшы з вядомых лістоў рабочых «Красного Выборжца» і Каменскай папяровай фабрыкі, яно знайшло нязвычайна хуткі і шырокі водгук. І гэта невыпадкова: сацспаборніцтва ня было навязана зьверху, ня было бюракратычным, інтэлігэнцкім вымыслам, яно было сапраўды вялікім пачынаньнем рабочых, што ўсьвядомілі сябе гаспадарамі вытворчасьці. Бо «упяршыню пасьля сталецьцяў працы на чужых, падневольнай працы на эксплёататараў зьявілася магчымасьць работы на сябе, і пры гэтым работы, якая апіраецца на ўсе заваяваньні самай новай тэхнікі і культуры». (Ленін).

Мы зьяўляемся сьведкамі зусім новых, сацыялістычных адносін на вытворчасьці. Рабочыя даюць узоры новай сацыялістычнай працоўнай дысцыпліны, новых адносін да працы, новых адносін да вытворчасьці.

Ударныя брыгады адна з форм, і пры гэтым вышэйшая сацыялістычнага спаборніцтва.

Найбольш сьвядомыя, перадавыя групы рабочых баруць на сябе вялікія абавязацельствы, паказваюць прыклад ударнай балвой работы, вядуць за сабой і заражаюць творчым энтузіязмам усю рабочую масу.

Ударніцтва, як рух, узьнікла нядаўна. Толькі некалькі месяцаў таму назад на прадпрыемствах БССР пачалі арганізоўвацца першыя ўдарныя брыгады. Ня гледзячы на такую моладасьць, ударныя брыгады ўжо маюць вялікія дасягненьні. Гэтыя дасягненьні на менскіх прадпрыемствах падагуліць адкрытая сёньня акруговая канфэрэнцыя ўдарных брыгад.

На Менскай швейнай фабрыцы «Кастрычнік» 528 рабочых з агульнае колькасьці ў 1.500 прымаюць удзел ва ўдарных брыгадах. Ударны цэх заводу дабіўся эканоміі сырцу на 2 проц. За 1928 год прадукцыйнасьць працы на фабрыцы ўзрасла на 37 проц. Сталярныя і сьлясарныя брыгады з вагонных майстэрань МБВ чыг. павялічылі прадукцыйнасьць працы на 18 проц., паменшылі брак—на 5 проц. Усяго ў майстэрнях —17 брыгад. Яны аб'яднаюць 25 проц. рабочых прадпрыемства.

На «Чырвонай Бярэзіне» ўдарныя брыгады здымальнага цэху выпрацавалі на 14,6 проц. больш, чым да арганізацыі брыгад. Прадукцыйнасьць працы аднаго рабочага фабрыкі ўзрасла в 1.243 скрынак запалак у дзень у першым квартале да 1.459 у апошнім квартале мінулага году. Прагулы ў другім квартале па няўважлівых прычынах складалі 0,64 проц., у трэцім—0,31, а ў чацьвертым—0,27 проц. Гэтыя посьпехі -непасрэдны вынік ўплыву ўдарнікаў на рабочую масу.

Не многіх прадпрыемствах ударнікі добраахвотна зьнімалі расцэнкі: на на хлебазаводзе—на 10 проц.—25 проц. (па асобных цэхах); у чыгуначных майстэрнях МБВ чыг.—на 10 проц., на «Бальшавіку» — на 4 проц. і г. д. Аднак, заработак ударнікаў відзе не панізіўся, дзякуючы росту інтэнсыўнасьці працы.

Трэба адзначыць, што ў апошнія тыдні назіраецца моцны колькасны рост ва ўдарных брыгадах. Гэтаму спрыяла кампанія праверкі сацыялістычных дагавароў. Так, да праверкі на 13 прадпрыемствах з агульнай колькасьцю 5.914 рабочых было 23 брыгады, якія аб'яднаюць 645 ударнікаў. Зараз на гэтых прадпрыемствах ужо 75 брыгад з 1.550 ударнікамі, што складае 26,2 проц. усіх рабочых.

Ударніцтва, разрастаючыся колькасна, пачынае набываць усё больш складаныя формы. Ад ударных брыгад рабочыя БССР пераходзяць да ўдарных цэхаў, зьмен і заводаў. На «Кастрычніку» ўжо ёсьць ударны цэх. З 1-га студзеня на ўдарнае палажэньне пераходзіць цэлая зьмена. На «Бальшавіку» арганізуецца ударны цэх. Рабочыя хлебазаводу абвясьцілі свой завод ударным.

На жаль, гэта масавае дасягненьне рабочых не заўсёды своячасова арганізацыйна ахапляецца прафесыянальнымі арганізацыямі. Біраўніцтва ўдарнымі брыгадамі, як і ўсім сацыялістычным спаборніцтвам, значна адстае ад росту актыўнасьці мас. На некаторых прадпрыемствах ударныя брыгады разваліліся з-за слабога кіраўніцтва фабзаўкомамі. Адміністрацыя фабрык і заводаў часта не аказвае дапамогі ўдарнікам. Па чыгуначных майстэрнях інструманты, прылады і матар'ялы падаваліся ўдарным брыгадам несваячасова. У другіх мясцох ударнікі атрымалі горшы сырэц. Часамі ўдарнікі перакідваліся з аднаго цэху ў другі, што, зразумела, прыводзіла да распаду брыгад.

Менская акруговая канфэрэнцыя ўдарных брыгад павінна паставіць ва ўвесь рост праблему кіраўніцтва ударнікамі. Прафсаюзы ня толькі павінны аказваць дапамогу ўдарным брыгадам. Яны павінны быць на чале руху, не плясьціся ў хвасьце ў масы, а весьці яе за сабой. Мэтады работы з ударнікамі, далейшыя шляхі гэтага руху, формы ахопу яго,—вось чаго чакаюць ударнікі ад канфэрэнцыі.

100 проц. ахоп рабочых сацыялістычным спаборніцтвам, ня менш паловы рабочых ва ўдарніках, — вось якія задачы стаяць перад намі. Гэтыя задачы мы з посьпехам вырашым толькі тады, калі прафсаюзы узмоцняць кіраўніцтва масавым рухам рабочых, калі яны на справе пяройдуць да новых мэтадаў работы.

ЦК КП(б)Б--МЕНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ ЎДАРНЫХ БРЫГАД

Баявым атрадам сацыялістычнага спаборніцтва—удзельнікам Менскай акруговай канфэрэнцыі ўдарных брыгад — бальшавіцкае прывітаньне.

Першы год пяцігодкі нашчэнт разьбіў усе панікёрскія прароцтвы правых апартуністых.

Першы год пяцігодкі наглядна паказаў, якія вялізарныя творчыя сілы ёсьць у нэтрахў рабочае клясы наглядна паказаў непераможную волю і настойлівасьць рабочае клясы ў справе сацыялістычнага будаўніцтва Савецкай краіны пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі.

«Прадукцыйнасьць працы,--кажа тав. Ленін,—гэта ў апошнім разрахунку самае важнае, самае галоўнае для перамогі новага грамадзкага ладу. Капіталізм стварыў прадукцыйнасьць працы нябачаную пры прыгоне, капіталізм можа быць канчаткова пераможаны і будзе пераможаны тым, што сацыялізм створыць новую, значна больш высокую, прадукцыйнасьць працы».

«Мы павінны прасякнуцца тым працоўным энтузіязмам, тэй воляй да працы і ўпартасьцю, ад якога цяпер залежыць хутчэйшае выратаваньне рабочых і сялян, выратаваньне народнае гаспадаркі».

Сацыялістычнае спаборніцтва зараз зьяўляецца выпрабаваным мэтадам у руках працоўных для пасьпяховага ажыцьцяўленьня генэральнай лініі Камуністычнай партыі на індустрыялізацыю краіны і сацыялістычную рэканструкцыю сельскай гаспадаркі.

Вітаючы першую ў Менску канфэрэнцыю ўдарных брыгад, Цэнтральны Камітэт КП(б)Б выказвае ўпэўненасьць, што не далёка той час, калі кожны цэх, калі кожнае прадпрыемства Беларусі зьявіцца баявым атрадам удзельнікаў сацыялістычнага спаборніцтва.

Няхай жыве сацыялістычнае спаборніцтва—магутная праява працоўнага энтузіязму рабочае клясы!

Няхай жыве рабочая кляса, якая пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі будуе і пабудуе сацыялізм у нашай краіне і наближае дзень перамогі камунізму ва ўсім сьвеце!

ЦК КП(б)Б.

Рабочыя ударнага лаечнага цэху заводу „Бальшавік"

Зьнішчым усе перашкоды на шляху сацспаборніцтва

Сёньня адкрываецца Менская акруговая канфэрэнцыя ўдарнікаў. Канфэрэнцыя павінна падагуліць вынікі масавай праверкі сацыялістычнага спаборніцтва і вызначыць шляхі далейшага яго разьвіцьця. Матар'ялы рабочых брыгад па масавай праверцы лішні раз падкрэсьліваюць, што сацыялістычнае спаборніцтва цалкам апраўдала сябе, як новая форма працы і як лепшы мэтад камуністычнага выхаваньня мас.

Той вялікі ўздым працоўнага энтузіязму, які праяўляецца рабочымі масамі ў сац. спаборніцтве, зацікаўленасьць рабочых у спаборніцтве, добраахвотнае павялічэньне норм выпрацоўкі і зьніжэньне расцэнак абверглі ўсе прароцтвы малавераў з права-апартуністычнага лягеру аб невыканальні нашых гаспадарчых задач. Гэты ўздым працоўнага энтузіязму паказаў, што асноўная маса рабочых усьвядоміла генэральную лінію партыі па індустрыялізацыі нашай краіны і калектывізацыі сельскай гаспадаркі.

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву нашай партыі і самаадданасьці рабочых мас, мы маем на галоўнейшых вучастках сац. будаўніцтва ня толькі выкананьне плянавых заданьняў, але і перавыкананьне іх.

Ініцыятыва рабочых мас вылілася ў адзін з лепшых мэтадаў сац. спаборніцтва—у арганізацыю ўдарных брыгад.

Паводле няпоўных даных з месц мы можам зусім канстатаваць, што на радзе прадпрыемстваў сыстэма ўдарніцтва паступова пераходзіць у масавую сыстэму. Па 13-ці прадпрыемствах колькасьць ударнікаў дсягае 1.550 чал., ці 25 проц. з агульнага складу рабочых гэтых прадпрыемстваў.

Побач з гэтым масавая праверка знайшла рад буйных недахопаў і адмоўным момантаў у адносінах утварэньня наўкола ўдарніцтва належнае вытворчае абстаноўкі і таварыскай атмасферы.

Кіраўніцтва прафарганізацыі сацспаборніцтвам у большай частцы насіла кампанейскі характар, сацспаборніцтва не зьяўляецца асноўнай формай работы прафсаюзаў і адсюль вынік, што ня ўсімі прафарганізацыямі ў поўнай меры ўсьвядомлена вялікае значэньне працоўнага ўздыму мае.

Слаба абстаіць справа са штодзённым кіраўніцтвам парт'ячэек сацспаборніцтвам, а асабліва работай ударных брыгад. Апошняя не стаіць яшчэ ў цэнтры ўвагі работы парт'ячэек, адсюль—невыстарчальная ініцыятыва асобных камуністых і камсамольцаў, якія працуюць у вытворчасьці.

Праверка таксама паказала, што адміністрацыйны пэрсанал у цэлым радзе выпадкаў стаіць з боку ад сацспаборніцтва, а ў некаторых выпадках сваімі адносінамі тармозіць далейшае разгортваньне сацспаборніцтва.

Слаба абстаіць справа ў адносінах удзелу спецыялістых у сацспаборніцтве ІТР, як правіла, актыўна ня прымалі ўдзелу ў сацспаборніцтве, ня было практычнай дапамогі з боку спецыялістых ударным брыгадам, рабочым вынаходцам і г. д.

Усе гэтыя недахопы павінны быць жорсткім чынам выкрыты праз рашучую пралетарскую самакрытыку. Канфэрэнцыя ўдарнікаў павінна завастрыць увагу ўсіх арганізацый на перашкодах па шляху да далейшага разгортваньня сацспаборніцтва. Кансэрватым прафарганізацый і гаспадарнікаў павінен быць зьнішчаны.

Уся ўвага ўсёй рабочай грамадзкасьці павінна быць мабілізавана на стварэньне адпаведнай абстаноўкі для работы ўдарных брыгад. Уся работа ўсіх парт., праф. і гаспадарчых органаў павінна быць падпарадкавана агульным задачам сацспаборніцтва.

РОЗІН.

ЗА 1 МЕСЯЦ--10 БРЫГАД

(Вагонныя майстэрні МБВ чыгункі)

— Не абгоніце, вельмі маладыя.

Так спаткалі зьяўленьне першых камсамольцаў-ударнікаў некаторыя рабочыя вагонных майстэрань МБВ чыг.

Ня лепшымі былі адносіны заводзкіх арганізацый і адміністрацыі, якія не зразумелі ўсёй важнасьці ўтварэньня на вытворчасьці ўдарных брыгад.

Камсамольцы першай сьлясарнай брыгады—першыя адзінкі і пачынальнікі новых камуністычных форм працы ў вагонных майстэрнях, давялі на справе, якіх вялікіх посьпехаў можна дабіцца пры дружнай і калектыўнай рабоце.

Брыгадзіры лепшыя вытворцы. Яны дабіліся амаль **поўнага зьнішчэньня прагулаў. Сталярная і сьлясарная брыгады зьнізілі расцэнкі на 10 проц., павялічылі прадукцыйнасьць працы ў сярэднім на 18 проц., зьменшылі брак да 5 проц., палепшылі якасьць работы.**

Маладыя рабочыя заразілі энтузіязмам і старых. І калі раней, у лепшым выпадку, да брыгадзіраў адносіліся роўнадушна, то **цяпер у майстэрнях ёсьць ужо брыгады маляроў і сьлесароў з старых рабочых.**

— Рабочая маса імкнецца раўняцца па ўдарніках,—кажуць рабочыя майстэрань.

Аб тым, якім аўтарытэтам зараз карыстаюцца брыгады, сьведчыць той факт, **што за адзін толькі апошні месяц пім брыгад у чыгуначных майстэрнях павялічыўся на 10. У майстэрнях—17 брыгад, якія аб'яднаюць каля 25 проц. рабочых.** Ударную брыгаду стварылі нават вучні навучальных майстэрань.

— Мы зараз ставім пытаньне аб ператварэньні ўсяго таварнага цэху ва ўдарны. У таварным цэху арганізаваліся першыя ўдарныя брыгады, у ім у сучасны момант сканцэнтравана большасьць брыгад, якія задаюць тон усім чыгуначным майстэрням.

Якія недахопы ў рабоце брыгад?

Аб гэтых недахопах гаварылі на многіх сходах рабочых, прысьвечаных праверцы выкананьня сацдагавораў. **Ударнікі да апошняга часу ня мелі падтрыманьня з боку мясцкому, вытворчай камісіі, адміністрацыі.** Вытворчая камісія наогул цэлы месяц ня зьбіралася. Адміністрацыя не ўтварыла спрыяючых умоў для работы ўдарнікаў. Прылады, інструманты, матар'ялы падаваліся несваячасова. Адстаюць яшчэ і цяпер падсобныя цэхі, якія затрымліваюць тэмп работы ўдарнікаў.

І толькі пасьля праверачных сходаў наглядаецца пералом у рабоце ўсіх заводзкіх арганізацый. Падцягнуўся мясцком, які пачаў цікавіцца работай ударнікаў. Палепшыліся адносіны і з боку адміністрацыі. Але трэба, каб гэты пералом ня быў часовым зьявішчам. Посьпехі ўдарнікаў чыгуначных майстэрань павінны быць замацаваны.

Ударнікі ў апошні час былі заняты падрыхтоўкай да Менскай акруговай канфэрэнцыі ўдарных брыгад. Праводзіліся гутаркі сярод рабочых, пытаньне аб гэтай канфэрэнцыі абгаворвалася на радзе сходаў. Падрыхтоўка знайшла адбітак і ў насьцэнгазэце.

Майстэрні пасылаюць на канфэрэнцыю 3-х дэлегатаў.

М. К.

ЛІК УДАРНЫХ БРЫГАД РАСЬЦЕ

Канкрэтныя вынікі праверкі сацыялістычных дагавароў

У выніку масавай праверкі сацыялістычных дагавароў па прадпрыемствах Менскай акругі значна вырасла колькасьць ударных брыгад.

Па 13-ці прадпрыемствах з агульнай колькасьцю рабочых у 5.914 чалавек да праверкі былі 23 ударныя брыгады, у якія ўваходзіла 645 ударнікаў. **Праверка сацспаборніцтва павялічыла зацікаўленасьць фабрычна-заводзкіх арганізацый і рабочых мас да ўдарных брыгад.** У выніку праверкі арганізаваны па гэтых-жа прадпрыемствах **73 новыя ўдарныя брыгады ў цэхах з агульнай колькасьцю 1.005 ударнікаў.** Такім чынам, зараз колькасьць ударнікаў па гэтых 13-ці прадпрыемствах дасягае 1.550 чал., што складае 26,2 проц. да ўсіх рабочых. Ёсьць прадпрыемствы, дзе гэты процант значна больш. Напрыклад, на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» ва ўдарныя брыгады ўцягнута 800 рабочых, што складае **60 проц.** да ўсіх рабочых, на заводзе імя Домбаля — 375 рабочых, што складае **35%** рабочых і г. д. На швейнай фабрыцы «Кастрычнік» да праверкі сандагавору ўдарных брыгад ня было зусім. У часе праверкі арганізаваны ўдарныя брыгады, куды ўцягнута 528 рабочых. Нават па саўгасах, дзе да праверкі дагавароў ня было ўдарных брыгад, **зараз арганізоўваюцца першыя ўдарныя брыгады.** У саўгасах **Дактаровічы і Ружамполь арганізаваны першыя ўдарныя брыгады колькасьцю ў 15 чалавек.**

Як правіла, ударныя брыгады даюць большую прадукцыйнасьць працы, чым няўдарнікі. Напрыклад, на заводзе імя Домбаля ўдарная брыгада вязальшчыц, у колькасьці 11-ці чалавек, увязвае ў месяц 717.602 шт. тавару, у той час, як калектыў радавых работніц, у колькасьці 13-ці чалавек, увязвае ў месяц 693.489 шт. тавару. Другая ўдарная брыгада да спаборніцтва працавала калектывам з 12-ці чалавек і ўвязвала 722.507 шт., а пасьля арганізацыі ўдарнай брыгады працуюць у колькасьці 9-ці чалавек і ўвязваюць 746.946 шт. у месяц.

Але гэта ня ўсё, чаго можна чакаць ад ударных брыгад, трэба сказаць адкрыта, калі-б ударныя брыгады сустрэлі больш чуласьці з боку заводзкіх арганізацый, яны-б далі значна больш.

На шчотачнай фабрыцы адміністрацыя і тэхнічны пэрсанал дрэнна адносяцца да ўдарнікаў. Былі выпадкі, калі ўдарнікам давяўся горшы сырэц. Фабком ударнікамі не кіраваў. Таму былі выпадкі, калі прадукцыйнасьць працы ўдарнікаў была ніжэй прадукцыйнасьці працы радавых рабочых. На заводзе **«Дрэваапрацоўшчык»** ударная брыгада разваліласа з прычыны таго, што асобных ударнікаў адміністрацыя перакідвала з аднаго цэху ў другі. На заводзе **«Камінтэрн»** у Барысаве яшчэ ў пачатку сацыялістычнага спаборніцтва арганізавалася ўдарная група ў 22 чалав., але група разчаў, на чале з партыйцамі, займалася цкаваньнем ударнікаў, пакуль брыгада не разваліласа. На фармзаводзе была арганізавана па ініцыятыве беспартыйных рабочых ударная брыгада, але яна ня сустрэла ніякай дапамогі з боку заводзкіх арганізацый і праз кароткі час разваліласа.

Больш-менш добра кіруюць ударнымі брыгадамі фабзаўкомы хлебазаводу МЦРК, фабрыкі «Прафінтэрн» у Барысаве і гарбарні «Бальшавік».

Гэтага нельга сказаць пра фабком цукернай фабрыкі «Прагрэс». Фабком ня цікавіўся праверкай сандагавору, не абгаворваў на сваіх пасяджэньнях вынікаў працы ўдарнай брыгады, а перадаў гэта пытаньне ў вытворчую камісію. Апошняя-ж заслухала даклад і пастанавіла— «прыняць да ведама».

П.



Ударная брыгада рамонтных майстэрняў (Менск) М. Бел. Б. чыгункі

ЧАГО ЧАКАЮЦЬ ЎДАРНІКІ АД КАНФЭРЭНЦЫІ

Ударнік--прыкладны грамадзкі працаўнік

(У парадку прапановы)

Ударніцтва зьяўляецца аднэй з арганізацыйных форм разгорнутага сацыялістычнага спаборніцтва. Масы рабочых, уступаючы ў сацспаборніцтва, арганізоўваюцца ва ўдарныя брыгады, умаўляюцца выканаць рад канкрэтных абавязкаў. Наконт гэтых абавязкаў няма належнай дагаворанасьці, няма належнай выразнасьці ва ўстанаўленьні гэтых абавязкаў. Трэба, каб ударная брыгада на сваім вучастку мела спецыяльныя заданьні. Гэта заданьне трэба даваць, выходзячы з фабрычнага дагавору па сацспаборніцтве. Дагэтуль ударныя брыгады «плывуць па волі хваляў».

Я прапаную, каб кожная брыгада на аснове фабрычнага дагавору складала для сябе плян работы: колькі прадукцыі трэба зрабіць, да якога разьмеру давесьці брак, якую ўстанавіць норму выпрацоўкі і г. д.

Ударныя брыгады з кожным днём ахапляюць усё больш шырокія масы рабочых.

На прадпрыемствах зараз узьнімаецца цікавае пытаньне: ці можна прыняць ва ўдарныя брыгады вядомага прагульшчыка, п'яніцу, наогул рабочага, які да гэтага часу не зьяўляўся прыкладным на вытворчасьці?

Што рабіць—пытаюцца многія — з тымі, хто ўжо ўступіў ва ўдарныя брыгады і там, як і раней, паказвае сябе нявытрыманым рабочым?

На гэтыя пытаньні трэба даць адказ. На нашым прадпрыемстве (Меншвэй) дагэтуль практыкавалі прыём ва ўдарныя брыгады няпрыкладных рабочых з умовай — справіцца, стане прыкладным рабочым,

Такая пастаноўка пытаньня зусім правільная.

Патрэбна штодзённая выхаваўчая работа прафэсыянальных арганізацый сярод адсталых рабочых. Вельмі добра было-б практыкаваць шэфства ўдарнікаў над адсталымі, недысцыплінаванымі рабочымі з мэтай падцягнуць іх да перадавых рабочых ударнікаў.

Неперадавых рабочых трэба ўмоўна прымаць у брыгады. Да тых, хто зноў пакажа сваю нядольнасьць і нежаданьне працаваць ва ўдарнай брыгадзе (якасьць працы, паводзіны), трэба ўжываць, самыя рашучыя меры грамадзкага ўплыву аж да выключэньня з брыгады. Тут прымірэнцтву ня можа быць месца.

Да гэтага часу ўдарнікі сканцэнтравалі сваю ўвагу на пытаньнях росту прадукцыйнасьці працы, уздыме вытворчасьці. Гэта першая і балвая задача. Але ўжо час пераходзіць і да іншых задач. Я маю на ўвазе наступнае: **ударнік павінен стаць прыкладным грамадзкім працаўніком у цэху і ва ўсім прадпрыемстве.**

Гэта значыць — ударнікі павінны зьявіцца аспоўным ядром вытворчых камісій і нарад, гуртком рацыяналізацыі вытворчасьці. Ударнікі павінны быць у першых радох ва ўсіх палітычных кампаніях; ударнікі павінны быць нашай галоўнай сілай у барацьбе з адсталымі настроямі, дробна - буржуазнымі ўплывамі сярод рабочых.

Вось чаго мы патрабуем ад ударнікаў. Мы лічым, што канфэрэнцыя распрацуе канкрэтныя абавязкі прафэсыянальных і гаспадарчых арганізацый у адносінах кіраўніцтва і дапамогі рабоце ўдарных брыгад.

Б.ШПЭНТАРАЎ.

ДЗЕЛАВЫЯ ПРАПАНОВЫ РАБОЧЫХ ПАВІННЫ БЫЦЬ ВЫКАНАНЫ

(Гутарка з майстрам ударнага варштату гуты „Пралетары" тав. Фамлюком)

Асноўная хіба нашай работы—адсутнасьць інструмантальнага аддзяленьня. Інструманту ў нас вельмі абмежаваная колькасьць. Часта бывае, што інструмант псуецца, а замяніць яго няма чым. У выніку—шмат прастояў па тэхнічных прычынах.

Адміністрацыя аб гэтым добра ведае. Амаль на кожным сходзе рабочыя выступаюць з прапановамі павялічыць запасы інструманту. Але наша адміністрацыя толькі абяцае.

Летам у нас паставілі вэнтылятары, на якія затрацілі каля 15.000 руб., але гэтыя вэнтылятары хутка папсаваліся і іх паздымалі аднаго за другім. Зімой вэнтылятары непатрэбны, але ўжо зараз трэба падумаць аб вэнтыляцыйнай устаноўцы на лета.

Трэба палепшыць работу ваннай печы. У апошні час было некалькі ізыпадкаў, калі па недагледзе шклавараў, шкляная маса ў ваннай печы была вельмі дрэнная, што значна павялічыла бой і брак начыньня. Трэба, каб тэхнічны кіраўнік сачыў за нармальнай работай ваннай печы, а таксама падняў кваліфікацыю шклавараў.

На ўсе гэтыя хібы рабочыя многа разоў паказвалі адміністрацыі. **Але апошняя не зварачае ўвагі на прапановы рабочых.**

Зьезд ударных брыгад павінен сказаць сваё важка слова наконт выкананьня прапаноў рабочых, асабліва тых рабочых, **якія працуюць ва ўдарных брыгадах.**

ДВА ВАЖНЫЯ ПЫТАНЬНІ

(Гутарка з актыўным ударнікам мэханічнага цэху заводу „Дрэваапрацоўшчык" тав. Екельчыкам)

Па маёй думцы, зьезд ударнікаў павінен вырашыць 2 важныя пытаньні.

Першае пытаньне—аб тэхнічным кіраўніцтве ўдарнымі брыгадамі. Пакуль што такога кіраўніцтва няма. Я лічу, што з ударнікамі трэба наладзіць сыстэматычныя заняткі—як практычныя, так і тэорытычныя—па падняцьці іх кваліфікацыі. У рабоце ударнікаў ёсьць яшчэ шмат недахопаў. Трэба дапамагчы брыгадам рацыяналізаваць іх працу, больш правільна разьмеркаваць работу паміж імі, палепшыць умовы працы ўдарных брыгад у сэнсе забясьпячэньня сырцом, матар'ялмі і г. д. Пакуль што тэхнічныя кіраўнікі зусім не зварачаюць увагі на работу ўдарных брыгад. Зьезд павінен даць дырэктыву гаспадарнікам узяць на сябе ўсю адказнасьць за работу ўдарных брыгад.

Ад заўкому і парт'ячэйкі зьезд павінен патрабаваць узмацненьня масавай работы з ударнымі брыгадамі. Гэта другое ня менш важнае пытаньне. Трэба асьвятляць работу ўдарных брыгад у насьцэнгазэтах і наогул у друку. Ударнікаў трэба ўцягнуць у вытворчыя камісіі і нарады. Не пашкодзіла-б таксама наладзіць экскурсію ўдарнікаў у буйныя гарады Савецкага Саюзу для азнаямленьня з работаю іншых заводаў.

Зьезд павінен таксама абгаварыць пытаньне аб арганізацыі сыстэматычнага абмену вопытам. Па маёй думцы, трэба арганізаваць сэмінары брыгад у гарадзкім маштабе.

ДАБІЛІСЯ ЗРУХУ

(Чырвонаштандарны завод „Энэргія")

Як мы раней адзначалі на старонках нашай газэты, арганізаваныя ўлетку на заводзе «Энэргія» ўдарныя брыгады распаліся, сацыялістычнае спаборніцтва замерла. Але за апошнія паўтара месяцы зроблены зрух. **На заводзе арганізавана 16 ударных брыгад, у якія ўступіла звыш 180 чал. рабочых.** Прыклад падалі камсамольцы заводу, усе як адзін уступіўшы ў брыгады.

Ударнікі пачынаюць ўжо рабіць уплыў сваім прыкладам на рэшту рабочых і цягнуць на буксіры за сабой менш сьвядомых. Адносіны рабочых да ўдарнікаў вельмі добрыя. Але трэба адзначыць, што ўдарныя брыгады яшчэ ня выкарысталі як належыць гэтых настрояў рабочай масы. Беспартыйныя рабочыя мала ўцягнуты ў брыгады. Гета віна брыгадзіраў, а таксама і фабкому, які як належыць ня кіруе брыгадамі.

У канцэльным цэху сярод рабочых ёсьць поўны настрой абвясьціць увесь цэх ударным і ўзяць на сябе рад абавязкаў па паляпшэньні якасьці прадукцыі і зьніжэньні сабекошту. Але канцэльны цэх высоўнае запатрабаваньне, каб рабочых своячасова забясьпечвалі як неабходнымі інструмантамі, так і сырцом. Вось гэты настрой рабочых не выкарыстоўваецца ні фабкомам, ні адміністрацыяй.

На зьезьдзе ўдарнікаў рабочыя заводу «Энэргія» хочуць абмяняцца думкамі з рабочымі іншых прадпрыемстваў, азнаёміцца з практыкай і дасягненьнямі рабочых брыгад, каб перанесьці гэту практыку і на свой завод.

П—кі.



Група ўдарнікаў менскага чыгуначнага вузла за работай

Сеньня адчыняецца Менская акруговая канфэрэнцыя ударных брыгад

Ударная брыгада «Дубровенскай мануфактуры».

Курс на ударны завод

(Ад нашага спэцкора)

Спачатку трохі гісторыі...

Ініцыятарамі сацыялістычнага спаборніцтва на фабрыцы «Чырвоная Бярэзіна» зьявіліся камсамольцы здымальнага цэху. Яшчэ ў красавіку яны стварылі ўдарныя брыгады ў абедзьвюх зьменах з 46 чал. 46 чал. на 1.200 работніц і рабочых фабрыкі! Піянэры сацспаборніцтва былі спатканы ў штыхі адсталымі работніцамі ф-кі «Гэта вам не жаночы ўдарны батальён! Што ў вас тры рукі ці што? Навошта вам гэта? Толькі нормы павысяць! З-за вас іншыя пацерпяць». Нават адміністрацыя з недавер'ем глядзела на гэтае пачынаньне. «Пашумяць, пашумяць і супакояцца —на тое і моладзь».

Цяжка было прабіваць тоўстую сьцяну роўнадушнасьці і нават варожых адносін. Аднак, дзяўчаты трымаліся моцна, трэба паказаць прыклад; нашага палку прыбудзе, нічога.

Выклік быў кінуты. У першыя-ж месяцы брыгады паказалі большую прадукцыйнасьць працы, чым іншыя работніцы, якія не зьяўляліся ўдарніцамі. На 3,2 проц. у красавіку, на 3,9 проц. у маі. Адначасова ўдарнікі растлумачвалі, убівалі ў мазгі значэньне ўдарніцтва, ролю спаборніцтва. Тут насьпела вытворчая канфэрэнцыя, якая завастрыла пытаньне аб сацспаборніцтве. Пачаліся гутаркі на цэхах, вытворчыя нарады. Лёд пачаў раставаць.

У чэрвені брыгады вырасьлі да 86 чал., у ліпені — да 96. Прадукцыйнасьць працы ўзрасла на 11,6 проц. Самы адсталы, самы нездаровы цэх — скрыначны — уцягнуўся ў спаборніцтва. На яго менш за ўсё спадзяваліся, лічылі, што там шмат бузацёрак, рвачоў. Жыцьцё давяло, якую вялікую ролю можа адыграць агітацыя паказам, пастаянная сыстэматычная папулярызацыйная праца. І там пачаліся спаборніцтвы брыгады з брыгадай, зьмены са зьменай, практыкаваліся індывідуальныя выклікі праз фабрычную газэту. Камсамолка Клябанава першая перайшла працаваць на 2 машынкі, яе прыкладу пасьледавалі работніцы Емельянава і Трымайлава. Прапанова Клябанавай аб пераходзе на дзьве машынкі была прынята цэхавай вытворчай нарадай.

З вялікімі труднасьцямі пераходзілі дзяўчаты на новыя метады работы — нялёгка было адвыкнуць ад старых звычак, але час узяў сваё. Зараз скрыначны цэх зьяўляецца самым перадавым на фабрыцы, ва ўдарныя брыгады ўвайшлі амаль усе работніцы, скрыначны, як лепшь ўдарны цэх, узнагароджаны раённай канфэрэнцыяй ударных брыгад чырвоным сьцягам. Цікава, што ў скрыначным цэху зараз ідуць гуткі аб пераходзе на тры машынкі.

Піянэр сацспаборніцтва — здымальны цэх — таксама ператварыўся ва ўдарны — лік ударнікаў ад 46 чал. у красавіку вырас да 330 чал. у верасьні— кастрычніку; прадукцыйнасьць працы павялічылася на 14,6 проц. — вынік спаборніцтва брыгад цэху.

Зараз мы маем на фабрыцы 17 ударных брыгад з 800 чал. — звыш 60 проц. агульнага ліку рабочых фабрыкі. Да раённай канфэрэнцыі ўдарных брыгад налічвалася 15 брыгад з лікам удзельнікаў 54 проц. рабочага калектыву.

Што далі ўдарныя брыгады? Аб гэтым красамоўна гаворыць лічбы. Калі ў 2-м квартале мінулага году было выпрацавана 77 тысяч скрынак запалак, дык у 3-м квартале 91.550, у 4-м— 82.898 (зьніжэньне з-за летняга часу). Ватэрпасаў у 2-м квартале было выпрацавана 2.596, у 4—4.284. Прадукцыйнасьць працы ўзрасла: па запалках з 1.243 скрынак у 2-м квартале да 1.460 у чацьвертым, выхад скрынак з рамы— ад 32,46 у 2 квартале да 34,06 проц. — у 4-м. Прагулы па няўважлівых прычынах, якія ў другім квартале складалі 0,64 проц., у 3-м складалі 0,31, у 4-м— 0,27. Здаецца, паказальнікі досыць выразна гаворыць аб тым, якія посьпехі дасягнуты ўдарнымі брыгадамі.

Як кіравалі сацыялістычным спаборніцтвам фабрычныя арганізацыі, як адносіўся трыкутнік да работы брыгад. Адміністрацыя, трэба гэта падкрэсьліць, холадна, пасыўна адносілася да ўдарнікаў. Разгортваньне масавай ініцыятывы натыкалася на кансэрватым заводакіраўніцтва. Характэрны прыклад: калі работніцы 2-й зьмены скрыначнага цэху парашылі па прыкладзе першай перайсьці на 2 машынкі, — адміністрацыя не дазволіла, бачыце, практыка яшчэ ня ўлічана. Калі група рабочых падала заяву аб арганізацыі ўдарнай брыгады, адміністрацыя стварыла бюракратычную перапіску па гэтым пытаньні.

Дагэтуль не наладжаны ўлік работы ўдарных брыгад па цэхах. У цэхах няма жывой інфармацыі аб зьменах у выпрацоўцы, аб руху браку і г. д. Спыткі, якія былі заведзены ў цэхах для ўліку вытворчых недахопаў, не вядуцца. Цэхавая адміністрацыя, галоўным чынам, рабочыя - вылучэнцы ня ведаюць, як кіраваць ударнымі брыгадамі, як інструктаваць старшынь брыгад. Ударныя брыгады атрымліваюць дрэнны матар'ял. Нарэшце, інжынэрна - тэхнічны пэрсанал фабрыкі амаль зусім не дапамагаў ударнікам.

Фабрыка «Чырвоная Бярэзіна» — не выключэньне. Адміністрацыйныя галавацяны заводу «Камінтэрн» ледзь не сарвалі сацспаборніцтва. Яны ўбачылі, што ўдарнікі павялічылі прадукцыйнасьць працы і самі бяз усякай дагаворанасьці з заводакіраўніцтвам, арганізацыямі павялічылі нормы выпрацоўкі з 18 куб. фут. да 33-х. Ініцыятыва рабочых была забіта.

Мала што зрабіў для кіраўніцтва работай ударных брыгад і фабком. Быў час, калі з-за адсутнасьці кіраўніцтва з боку прафарганізацыі хваля спаборніцтва пачала спадаць, ударныя брыгады пачалі распадацца, паслабла ўвага рабочых да сацспаборніцтва. Толькі ў пэрыяд падрыхтоўкі да раённай канфэрэнцыі ўдарных брыгад, у пэрыяд праверкі дагавароў па сацспаборніцтве, заключаных паміж брыгадамі, цэхамі і зьменамі ўдалося зноў узьняць хвалю спаборніцтва.

Былі праведзены гутаркі па цэхах, цэхавыя і зьменныя сходы, агульна-фабрычная вытворчая канфэрэнцыя, на якіх ставіліся даклады аб дасягненьнях сацспаборніцтва. Вялікую работу выканала выбраная канфэрэнцыяй часовая кантрольная камісія, якая падагуліла работу 15 брыгад, што правяралі ход спаборніцтва. Між іншым, старшыня райпрафбюро ў гутарцы з нашым спэцкорам адзначыў, што на іншых прадпрыемствах г. Барысава фабзаўкомы і вытворчыя камісіі дрэнна кіруюць спаборніцтвам і работай ударных брыгад. Але справа ў тым, як заяўляюць фабкомцы «Чырвонай Бярэзіны», што і райпрафбюро абмяжоўвалася абежнікамі і не праводзіла жывога кіраўніцтва сацспаборніцтвам: ні разу ня былі скліканы нарады старшынь вытворчых камісій, старшынь ударных брыгад.

На акруговую канфэрэнцыю ўдарных брыгад ад «Чырвонай Бярэзіны» едуць старшыня часовай кантрольнай камісіі Мурашка і ўдарніца Емяльянава. Мурашка выбраны старшынёй Барысаўскай дэлегацыі ўдарнікаў, якая ў ліку 5 чал. едзе на канфэрэнцыю.

Дэлегаты «Чырвонай Бярэзіны» паведамяць канфэрэнцыю аб тым, як з маленькіх брыгад вырасьлі ўдарныя цэхі, падзелядца новай практыкай ударнай працы — стварэньнем калектыўнай работніц з аднолькавай кваліфікацыяй, якія бяруць на сябе калектыўна пэўную норму, заработак дзеляць пароўні і спаборнічаюць у большай выпрацоўцы (калектывы ў скрыначным і ватэрпасным цэхах), — завострацца пытаньне аб кіраўніцтве работай ударных брыгад. Ударнікі «Чырвонай Бярэзіны» ўпэўнены, што пасьля канфэрэнцыі ва ўдарныя брыгады ўвойдуць усе 1.300 рабочых фабрыкі. І тады... «Чырвоная Бярэзіна» стане першай ударнай фабрыкай.

Б—ў.



Ударнікі зав. «Бальшавік» краснадубнага цэху (валкарнае аддзяленьне).

Пералом ёсьць!

На гуце «Пралетары» недаацанілі значэньня ўдарных брыгад. Калі Валынская гута выклікала Менскую гуту на спаборніцтва, тады па ініцыятыве камсамольскай ячэйкі была створана ўдарная брыгада або, інакш кажучы, ударны варштат. Але праз 2 тыдні гурток развалёўся. Заводзкія арганізацыі тлумачаць гэта тым, што 2 камсамольцы найшлі на лятерны збор. Пасьля гэтага аб ударных брыгадах забыліся.

Праўда, сацыялістычнае спаборніцтва, як быццам разгарнулася досыць шырока. З 36 варштатаў (варштата-зьмен) удзельнічае ў спаборніцтве 19. Усяго спаборніцтва ахапляе 157 чалавек з 350. Але трэба сказаць, што заводзкія арганізацыі зрабілі вялікую памылку, недаацаніўшы ролі ўдарных брыгад у сацыялістычным спаборніцтве.

Толькі нядаўна, даён дзесяць назад, рабочыя гуты «Пралетары» арганізавалі 2 ударныя варштаты, адзін з іх арганізаваны на ініцыятыве камсамольскай ячэйкі, другі па ініцыятыве ячэйкі Асоавіяхіму. І вось мы ўжо маем першыя вынікі. У парадку спаборніцтва гэтыя варштаты раней выпрацоўвалі 2.700-2.800 бутэлчак, зараз выпрацоўваюць па 2.940 у дзень і нават больш. Вось што значыць ударная брыгада!

Як адносяцца да заводзе да ўдарных брыгад? Рабочыя трохі пасьмейваюцца, але адначасова зьдзіўлены высокай выпрацоўкай. Адміністрацыя пакуль што не зважае на ўдарную брыгаду ніякай увагі. Ёсьць рад тэхнічных дэфэктаў, якія перашкаджаюць нармальнай працы, напрыклад, адсутнасьць запасных інструмантаў, дрэнная якасьць шкляной масы ў ваннай печы і г. д. Прапановы рабочых аб зьніжэньні ўсіх перашкод у вытворчасьці не сустракаюць належнай увагі адміністрацыі. Што датычыць заўкому і парт'ячэйкі, то яны лічаць арганізацыю ўдарных брыгад справай камсамолу і пакуль што актыўнай дапамогі ўдарным брыгадам не аказваюць.

Наогул рабочым гуты няма чым пахваліцца. Праўда, у выніку раду рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў сабекошт прадукцыі зьніжаны на 7,18 проц. замест 6 проц., якія былі вызначаны па сацыялістычным дагаворы. Але прадукцыйнасьць працы павышана ўсяго на 0,26 проц., замест 7 проц., вызначаных па дагаворы. Над гэтай лічбай рабочым гуты і заводзкім арганізацыям трэба добра задумацца. Таксама трэба задумацца над вельмі высокім процантам бою і браку, які дасягае 7,99 проц., замест 3 проц., якія былі прыняты па сацыялістычным дагаворы. Заўком тлумачыць гэта зьявішча папершае, няўважлівымі адносінамі рабочых да начыньня (у асобных выпадках брак доходзіць да 15 проц.), падругое, нядбайнымі адносінамі адміністрацыі да тэхнічных недахопаў (несваячасовае падаграваньне цягнульні, дрэннае становішча форм і інструмантаў і інш.). На зьніжэньне гэтых недахопаў і трэба кінуць ударныя брыгады.

Як адносіцца да спаборніцтва партыйны калектыў і прафактыў? Аб гэтым гаворыць досыць выразна лічбы: з 79 членаў партыі прымаюць удзел у сацыялістычным спаборніцтве толькі 19 чалавек і з 84-х камсамольцаў—толькі 25 чалавек, прафактыў прымае ў спаборніцтве зусім слабы ўдзел. Гэтым актывістым трэба навучыцца хаця-б у пакавальшчыкаў.

24-га кастрычніка пакавальшчыкі Касьцюк, Касабуцкі і Вайцюк падалі заяву аб жаданьні зьніжіць расцэнкі на 3 кап. ад скрыні і выклікалі пасьледаваць іх прыкладу вязальны цэх. Здаецца 3 кап.—невялікія грошы, але эканамічны эфэкт ад гэтага зьніжэньня складае на працягу году 700 руб. эканоміі.

Некаторы пералом наглядзецца і ў працы тэхнічных працаўнікоў заводу. Нядаўна тэхнічныя прапаўнікі пастанавілі арганізаваць 2 гурткі па ліквідацыі тэхнічнай няпісьменнасьці сярод рабочых і падняцьці кваліфікацыі майстроў. Ужо арганізаваны гурток па вывучэньні тэхналёгіі шкла, які налічвае 10 чалавек, і гурток па вывучэньні калькуляцыі, у які пакуль што запісалася 4 чалавекі. Акрамя таго, тэхнічны кіраўнік тав. Бэйлін узяў на сябе абавязак перакваліфікаваць шклавараў і матар'яльшчыкаў. Гэта павінна палепшыць якасьць шкляное масы і наогул прадукцыі заводу.

Усё гэта гаворыць аб тым, што на заводзе ёсьць здаровы пералом і што сацыялістычны дагавор бягучага гаспадарчага году будзе выкананы.

Р—п.

ЦЭЛАЯ ЗЬМЕНА ПЕРАХОДЗІЦЬ НА ЎДАРНУЮ РАБОТУ

(Швэйная фабрыка „Кастрычнік")

З 1.500 рабочых—528 ударнікаў, 40 ударных брыгад і ударны закройны цэх.

За 1928 год прадукцыйнасьць працы ўзьнята на 37 проц. У бягучым годзе пастаўлена задача ўзьняць прадукцыйнасьць працы на 40 проц. Сабекошт прадукцыі зьніжаны ў 1928-29 годзе на 6 з паловай проц., у 1929-30 годзе ён павінен быць зьніжаны на 11 з паловай проц.

Сэрца вытворчасьці—закройны цэх— за першы месяц сваёй працы ва ўдарным парадку дасягнуў эканоміі ў выдаткаваньні сырцу на 2 проц.

Вось з чым прыходзяць рабочыя Менскай швэйнай фабрыкі «Кастрычнік» на канфэрэнцыю ўдарнікаў.

Як расьлі і ўзмацняліся ўдарныя брыгады?

У верасьні была праведзена праверка выкананьня сандагавароў. Высьветлілася, што многія пункты дагавору ня выкананы. Вось тады група старых рабочых парашыла арганізаваць першую ўдарную брыгаду Паступова ініцыятыўныя групы разрасталіся і пры дапамове цэхавых вытворчых нарад брыгады пачалі расьці. У пачатку ўдарныя брыгады ня сустрэлі належнага палтрыманьня з боку адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Прапановы ўдарнікаў праходзілі міма адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу. Зараз большасьць тэхнічнага пэрсаналу зьяўляюцца ўдарнікамі і цалкам дапамагаюць у працы ўдарных брыгад.

Дзякуючы ўдарнай працы заводу, у кастрычніку плян выпуска прадукцыі выкананы на 110 проц. Замест намечаных да выпуску 32.465 польтаў выпушчана 35.916 польтаў, прычым значна лепшай якасьці работы.

Вытворчыя камісіі прымалі значны ўдзел у арганізацыі ўдарных брыгад. Члены вытворчых камісій вылучаны ў якасьці старэйшых па працы брыгад. Вылучаны старэйшыя зьвеньняў, якія сочаць за працай зьвеньняў. Пры кожным аграгаце на відным месцы вывешаны спэцыяльны кнігі («кнігі непарадкаў»), у якіх рабочыя запісваюць недахопы ў працы брыгад і свае прапановы.

Рабочыя фабрыкі, парт'ячэйка і заўком узялі цьвёрды курс на тое, каб яшчэ да 1-га студзеня ўся першая зьмена—700 рабочых—была пераведзена на ўдарную работу.

Побач з вялікімі дасягненьнямі ёсьць рад недахопаў.

Рост ударных брыгад ішоў амаль самацёкам. Шырокай папулярызацыі працы ўдарных брыгад ня было. Старэйшыя ўдарныя брыгады скардзяцца на тое, што яны дасканала ня ведаюць сваіх абавязкаў і што яны павінны рабіць. Існуе роўнаналежнасьць у працы вытворчых камісій і ўдарных упоўнаважаных.

Ня гледзячы на тое, што ў большасьці ўдарнікі зьнішчылі зусім прагулы і спазьненьне на работу, усё-ж сярод некаторых ударнікаў наглядаецца недысцыплінаванасьць (гутаркі ў часе працы). У некаторых аграгатах (аграгат № 2) рабочыя ўдарнікі яшчэ ня маюць належнага ўплыву на іншых рабочых.

Толькі зараз выпускаюцца спэцыяльныя нумары цэхавых газэт, прысьвечаныя працы ўдарнікаў і канфэрэнцыі ўдарных брыгад.

Падрыхтоўка да зьезду ўдарнікаў пачалася яшчэ ў кастрычніку. Быў скліканы спэцыяльны зьлёт ударных брыгад заводу, на якім з дакладам аб задачах брыгад на фабрыцы выступіў член ЦК швэйнікаў т. Гурэвіч. На канфэрэнцыю ўдарных брыгад фабрыка «Кастрычнік» вылучыла 12 чалавек.

А.

На правільным шляху

З першай ударнай брыгадай заводу «Дрэваапрацоўшчык» не павяло. Працаваўшы кароткі час, брыгада з 9-ці чалавек распалася. Асноўная прычына —поўная пасьўнасьць заводзкіх арганізацый, у тым ліку адміністрацыі. Ня было створана адпаведнай абстаноўкі для работы ўдарнай брыгады, ня была мабілізавана грамадская думка.

Цяпер справа абстаіць інакш. На заводзе зараз арганізавана 7 ударных брыгад, у якія ўцягнуты 64 чалав. з агульнай колькасьці рабочых у 310 чалавек. Прыбліна 35 ударнікаў складае моладзь, рэшта—дарослыя рабочыя і старыя.

Кіруе ўдарнікамі камсамольская ячэйка. Бюро ячэйкі КП(б)Б пакуль што прымае слабы ўдзел у гэтай працы. Як вынік гэтага — ва ўдарныя брыгады ўцягнута ўсяго толькі процантаў 10 партыйцаў. Шмат аб гэтай ненармальнасьці гаворыць зараз на чыстцы ячэйкі.

Фабзаўком трохі дапамагае, але слаба. Вытворчая камісія таксама стаіць у баку. Адміністрацыя амаль не зварачае ўвагі на работу ўдарных брыгад.

Затое рабочая маса адносіцца да ўдарнікаў вельмі добра, цікавіцца іх працай. Ударнікі служаць пракладам для ўсіх іншых рабочых і таму амаль кожны дзень павялічваецца колькасьць ударнікаў.

Ад ударнай брыгады да ўдарнага цэху і заводу! Пад гэтым лёзунгам разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва на заводзе. Апрацоўчны цэх, які налічвае 11 чалавек, стаў увесь ударным. Шмат цікавага, нават і для іншых заводаў, знаходзім у сацыялістычным дагаворы ўдарнай брыгады зборачнага і мэханічнага цэхаў. Вось некалькі найбольш цікавых пунктаў:

— Мы, ударнікі, бярэм на сябе абавязак ушчыльніць рабочы дзень, адмаўляемся ў часе працы весьці паміж сабою гуткарі па сваіх асабістых справах, на працягу ўсяго дня курыць ня больш 2-х раз, за 5 мінут да гудка прывесьці ў парадак варштаты.

— У адказ на факты ўтойваньня інтэнсыўнасьці працы з боку некаторай часткі адсталых рабочых у часе спроб для вылічэньня расцэнак, мы, ударнікі, просім тарыфна-нармоўчае бюро ў такіх выпадках рабіць спробы на больш шырокую выпрацоўку сярод нашых ударнікаў, прычым абяцаем даць максымальную інтэнсыўнасьць працы і лепшую якасьць прадукцыі.

— Абавязваемся весьці рашучую барацьбу супроць выпуску прадукцыі дрэннай якасьці і браку і, у выпадку выпуску прадукцыі дрэннай якасьці па нашай віне, пераапрацоўку бярэм на свой кошт. Таксама абавязваемся не перадаваць нядобраякасны паўфабрыкат у наступны працэс апрацоўкі і г. д.

Рабочыя заводу «Дрэваапрацоўшчык» ідуць па правільным шляху.

Д.

МАГУТНАЯ ХВАЛЯ АБУРЭНЬНЯ ПРАЦОЎНЫХ ЗАХ. УКРАІНЫ ПРАВАКАЦЫЙНАЙ КАМПАНІЯЙ УНДО

Дэманстрацыйныя выступленьні украінскіх рабочых супроць УНДО

РАЗГРОМ ДЭМАНСТРАНТАМІ РЭДАКЦЫІ УНДО

ВАРШАВА, 28. Правакацыйная кампанія, якую вядзе УНДО, каторае ўзяло на сябе ролю застрэльшчыка ў кампаніі супроць УССР і спачуваючых УССР элемэнтаў у Заходняй Украіне, выклікала магутную хвалю абурэньня з боку працоўных Заходняй Украіны. 27-ністапада ў Львове адбыўся рад дэманстрацыйных выступленьняў супроць ундоўскіх органаў друку. Дэманстранты разграмілі рэдакцыю органаў УНДО „Новае жыцьцё" і „Нядзеля", якія вядуць шалёную антысавецкую кампанію. Паліцыя разагнала дэманстрантаў і арыштавала некалькі чалавек. Арыштаваныя абвінавачваюцца ў прыналежнасьці да кампартыі Зах. Украіны.

Украінскія фашысцкія студэнты рабілі спробу адказаць на рабочыя дэманстрацыі другім выступленьнем супроць савецкага консульства ў Львове, шлях да якога, аднак, быў адрэзаны паліцыяй.

Выступленьне украінскіх рабочых супроць нацыянал-фашысцкіх органаў друку зрабіла ва украінскіх і польскіх колах вялікае ўражаньне. Друк разглядае ўчарайшыя падзеі ў Львове, як адказ на напёт украінскіх фашыстых на савецкае консульства.

Шалёная падрыхтоўка фашысцкай Польшчы да вайны супроць СССР

Пад кіраўніцтвам польскіх фашыстых створаны адзіны блёк нацыянапфашыстых нацменшасьцяй Польшчы

ВАРШАВА, 28. Учора ў памяшканьні клюбу УНДО ў сойме адбылася нарада прадстаўнікоў згодніцкіх партый нацыянальных меншасьцяй з удзелам УНДО, украінскіх радыкалаў, украінскіх сацыял-дэмакратаў і украінскага сялянскага саюзу. З боку беларускіх згоднікаў на нарадзе прымалі ўдзел прадстаўнікі групы Ярэміча, беларускіх сялянскіх дэмакратаў і беларускага нацыянальнага аб'яднаньня.

Галоўным арганізатарам нарады зьяўляецца, зразумела, лідэр УНДО Лявіцкі. З палітычным дакладам на нарадзе выступіў Лявіцкі. Даклад пакуль не апублікаваны, але, паводле вестак, на гэтай нарадзе Лявіцкі падкрэсьліў неабходнасьць асобай пільнасьці з боку нацыянальных меншасьцяй, якія жывуць на тэрыторыі па суседзтве з СССР, з прычыны «нязнасьці міжнароднага становішча наогул і магчымых падзей на Савецкай Украіне».

Нарада пастанавіла прыступіць да больш цеснага супрацоўніцтва нацыянальных меншасьцяй. Для гэтай мэты ўчора абрана сталая ўзгадняльная камісія. У палітычных колах разглядаюць учарайшае выступленьне нацменшасьцяй, у першую чаргу, з пункту погляду яго міжнароднага значэньня, ня ўтойваючы, што яно, паводле думак яго ініцыятараў, накіравана сваім лязом супроць СССР.

ПАДРЫХТОЎКА ДА УСЕЗУРАПЭЙСКАГА СЯЛЯНСКАГА КАНГРЭСУ У ПОЛЬШЧЫ

29 верасьня ў Варшаве адбылося першае арганізацыйнае паседжаньне камітэту па падрыхтоўцы кангрэсу працоўнага сялянства капіталістычных краёў Эўропы.

У паседжаньні прымала ўдзел звыш 20 чалавек, якія сабраліся з усіх канцоў Польшчы.

Сярод удзельнікаў нарады былі: старшыня праўленьня левай сялянскай партыі, «Сялянская самадапамога»—старэйшы сялянскі дзяяч Бомба (Галіцыя), дэпутат сучаснага сойму па сьпісе «Самадапамогі» Вайтовіч, дэпутат Вальніцкі ад «Аб'яднанага Сельробу» (сельска-рабочае аб'яднаньне, у аднаку ад правага «Сельроба», абанкрутаваныя правадыры якога здрадзілі справе рабочых і сялян), радыкальны беларускі дэпутат Крынчык, нямецкі малазямельны сялянін Адлер з Познані, сельска-гаспадарчы рабочы Цэркош, таксама з Познані. Затым у паседжаньні прымалі ўдзел і беспартыйныя сялянскія дзеячы і нават нізавыя дзеячы са згодніцкіх сялянскіх партый—«Вызваленьне» і Сялянскае партыі.

Сабраўшыяся падпісалі заяву, у якой паказаны мэты будучага кангрэсу. Згодна гэтай заявы кангрэс павінен быць выяўленьнем міжнароднай салідарнасьці працоўнага сялянства капіталістычных краёў Эўропы ў яго барацьбе за рабоча-сялянскі ўрад, за зямлю бяз выкупу, за права на вольнае самавыначэньне прыгнечаных нацыянальнасьцяй, супроць імпэрыялістычных войн і фашызму. Потым заява падкрэсьлівае, што адзіным саюзьнікам працоўнага сялянства можа быць толькі пралетарыят, які даўно ўжо вядзе заядлую барацьбу з капіталам, каторы аднолькава прыгнятае ўсіх працоўных.

Заява паказвае, што сяляне павінны ўзяць справу па падрыхтоўцы кангрэсу ў свае рукі.

Пасьля прыняцьця гэтай заявы, удзельнікі паседжаньня прыступілі да абгаварэньня арганізацыйных пытаньняў.

Было пастаноўлена зараз-жа прыступіць да закладкі акружных, павятовых і валасных камітэтаў, якія павінны заняцца арганізацыяй масавых сходаў працоўнага сялянства. У канчатковым выніку гэтыя масавыя сходы павінны вызначыць і выбраць дэлегатаў на кангрэс. Далей пастаноўлена выдаваць спэцыяльны бюлетэнь, першы нумар якога выйшаў 20 кастрычніка.

Для кіраваньня працаю па падрыхтоўцы кангрэсу нарада абрала прэзыдыум з 7 чалавек.

У апошні час буржуазны друк адкрыў шалёную кампанію супроць гэтага кангрэсу.

Бюджэт БССР павялічаны на 6 з лішкам мільёнаў руб.

(Ад нашага маскоўскага карэспандэнта)

Масква, 29 (па тэлефону)

Пленум бюджэтнай камісіі ЦВК БССР разгледзеў дзяржбюджэт Саюзу, які перадаецца на зацьвярджэньне сэсіі ЦВК СССР, і павялічыў асыгнаваньні па дзяржбюджэце БССР на правядзеньне раду неадкладных мерапрыемстваў.

Дзяржбюджэт БССР быў зацьверджаны СНК СССР у суме 133,6 мільёна рублёў. Пленум бюджэтнай камісіі пастанавіў павялічыць бюджэт БССР да 140 мільёнаў рублёў. Павялічваюцца сродкі на разьвіцьцё зканамічна адсталых округ. Акрамя таго, прадугледжваюцца спэцыяльныя асыгнаваньні ў разьмеры 2-х мільёнаў рублёў на правядзеньне пляну ўсеагульнага пачатковага навучаньня.

Асыгнаваньні на гандлёвае будаўніцтва павялічваюцца на 900.000 рублёў, з іх 500 тысяч рублёў — на будаўніцтва мясного камбінату ў Віцебску коштам у 3 мільёны рублёў.

Буйны рост калгасаў у БССР

Арганізацыя 155 вузка-спэцыялізаваных калгасаў

На 15-е лістапада па БССР арганізавана 1.946 калгасаў на плошчы 574.690 гэктараў зямлі, з іх каля 150 буйных калгасаў з плошчай звыш 1.000 гэкт. На першым месцы па калектывізацыі знаходзіцца Магілёўшчына—397 калгасаў на плошчы 160.400 гэкт., Бабруйшчына — 250 калгасаў з плошчай 85.118 гэкт., Мазыршчына—172 калгасы з плошчай 59.555 гэктараў. Калгасамі пакрыта 6 з пал. проц. агульнай плошчы БССР.

У 1930 годзе Белкалгассаюзам намечана арганізацыя 155 буйных вузка-спэцыялізаваных калгасаў, з якіх 25 сьвіноводных, 100 бульбяна - жывёлагадоўчых, 15 садоўніцкіх, 10 малочных і 5 ільнаводных.

Апрача таго, ствараюцца 4 буйныя малочныя фэрмы пад Магілевам, Віцебскам, Гомелем і Менскам.

Беларуская будаўнічая прамысловасьць --у дапамогу калектывізацыі

Пабудова чарапічнага заводу ў Клімавіцкім раёне

Белстрамтрэст намеціў рад мерапрыемстваў у дапамогу калектывізацыі. У Клімавіцкім раёне вырашана пабудаваць чарапічны завод з прадукцыйнасьцю ў 1 мільён штук чарапіцы ў год для забясьпячэньня будаўніцтва ў калгасах. На яго пабудову адпушчана 100 тысяч руб. Завод будзе гатовы ў 1930 годзе.

Апрача таго, пачата пабудова такога-ж чарапічнага заводу ў Віцебску. Завод будзе забясьпечваць чарапіцай у першую чаргу калектыўныя гаспадаркі Віцебчыны.

Як імпэрыялістыя думаюць „разбройвацца"

АМЭРЫКА БУДУЕ 5 НОВЫХ КРЭЙСЭРАЎ

ВАШЫНГТОН, 27. Морскае ведамства працягвае будаваньне 5 новых крэйсэраў, якія прадбачаны нядаўна прынятым законам аб пабудове 15 новых крэйсэраў. У колах морскага міністэрства ня крыюцца, што міністэрства ня спыняла пабудовы новых крэйсэраў, ня гледзячы на надыходзячую лёндонскую канфэрэнцыю морскіх дзяржаў.

МІЛЬЯРДЫ ФРАНКАЎ НА МОРСКАЕ БУДАЎНІЦТВА АСЫГНОЎВАЕ ФРАНЦЫЯ

ПАРЫЖ, 28. «Гавас» паведамляе: «Морская камісія палаты ўхваліла паданы морскім міністрам Лейгам бюджэт на 1930 год. Бюджэт устаноўлены ў разьмеры 2 мільярды 583 мільёны франкаў ад бюджэту 1914 г. і вельмі невялікі ў параўнаньні з ангельскай морскай праграмай, якая складае 7 мільярдаў франкаў. (ТАСС).

Буржуазны друк аб абмене тэлеграмамі паміж Чжан Сюэ-лянам і т. Літвінавым

ФРАНЦУСКІЯ ІМПЭРЫЯЛІСТЫЯ РАЗДРАЖНЕНЫ НЕМАГЧЫМАСЬЦЮ ДАПАМАГЧЫ КІТАЙСКАЙ ВАЕНШЧЫНЕ

ВЭРЛІН, 28. Орган дэмакратычнай партыі «Вэрлінэр Тагэблят» адзначае, што капітуляцыя Кітаю зьяўляецца посьпехам пасьлядоўнай палітыкі савецкага ўраду. «Перад тварам несправядлівасьці, нанесенай Савецкаму Саюзу Кітаем,—піша газэта,—кіраўнікі замежнай палітыкі СССР далі ўзор дзяржаўнай мудрасьці, праявіўшы стрыманасьць, якая дазволіла ім да канца настойваць на сваім першапачатковым рашэньні».

ПАРЫЖ, 28. Уся француская прэса на відным месцы зьмяшчае тэлеграму ТАСС аб згодзе Мукдэнскага ўраду распачаць перагаворы на пастаўленых Савецкім урадам умовах. Чырвоную нітку ва ўсіх выступленьнях друку праходзіць упэўненьне, што якая-б там ні была ўмяшальнасьць дзяржаў у савецка-кітайскі канфлікт зьяўляецца зусім неажыцьцявімай. Тым ня менш, ня гледзячы на цьвёрдае ўпэўненьне ў немагчымасьці ўмяшальнасьці ў савецка-кітайскі канфлікт, газэты ў афіцыёзным камэнтары тэлеграм адначасова заяўляюць: «Нельга пакінуць зусім без адказу выступленьня прадстаўнікоў Нанкінскага ўраду, бо ігнараваньне іх служыла бы маральным ударам па іх. Газэты ў той-жа час падхопліваць вывад «Журналь дэ-Дэба», што, калі Кітай хоча дапамогі ад дзяржаў, ён павінен пайсьці на ўступкі ў пытаньні аб няроўнаправных дагаворах.

«Тан» у перадавой, прысьвечанай савецка-кітайскаму канфлікту, в вялікім раздраўненьнем вымушаны прызнаць (разам з усім афіцыёзным друкам) немагчымасьць рэальнае ўмяшальнасьці ні Лігі Нацый, ні ўдзельнікаў пакту Кэлёга ў савецка-кітайскі канфлікт, каб зрабіць які-небудзь націск на савецкі ўрад.

АНАРХІЯ НА К.-У. ЧЫГУНЦЫ

ТОКІЁ, 28. Як паведамляюць з Харбіна, там у апошнія дні, у сувязі з эвакуацыяй сабралася звыш 12 тысяч уцекачоў. Цягнікі ходзяць зараз да Буховду. Раён, які ляжыць на захад ад Буховду, аб'яўлены ваеннаю зонаю. Каля Хайлара папсаваны мост. На станцыі Якешы здарылася крупэньне таварнага цягніка, 6 вагонаў зышлі з рэек, што выклікала часовы перапынак у руху. Кіраўніцтва чыгункі страціла кантроль над лініямі. Часткова кантроль перайшоў да ваеннага камандаваньня, а ў асноўным да «улад на мясцох».

Французскі пралетарыят салідаран з кожным крокам Чырвонай арміі

ПАРЫЖ, 27. «Эвр» (блізкая да міністэрства замежных спраў) прызнае, што Мукдэн парушыў захватам К-У. чыгункі свае міжнародныя абавязацельствы, якія закранаюць ня толькі савецкія інтарэсы. Газэта адмаўляе навучнасьць становішча вайны на савецка-кітайскай мяжы, характарызуючы сутычкі, як узаемныя паераджальныя ваенныя дзеяньні.

«Юманітэ» адзначае, што руйнуючы ўдар, нанесены Чырвонай арміяй кітайскім генэралам і рускім белагвардзейцам, быў неабходным законным адказам на бязупынныя правакацыі, гвалты і налёты на савецкую тэрыторыю.

Адказваючы на артыкул рэфармісцкай «Пэпль», «Юманітэ» характарызуе яго, як непасрэдны зварот рэфармістых да імпэрыялістых з заклікам да адкрытае ўмяшальнасьці ў савецка-кітайскі канфлікт. «Юманітэ» падкрэсьлівае, што французкі пралетарыят цалкам салідарны з кожным крокам Чырвонай арміі, лічачы, што адзіным, сапраўдным міжнародным фактам міру зьяўляецца салідарнасьць сусьветнага пралетарыяту з Савецкім Саюзам у барацьбе супроць імпэрыялізму.

Абвастрэньне клясавай барацьбы ў краінах капіталу

Дэманстрацыі пратэсту супроць расправы над рэвалюцыянэрамі

ВЕНА, 26-11. У Софіі і ваколіцах наладжваюцца лятучыя сходы пратэсту супроць суду над 52-ма рэвалюцыянэрамі. Сходы склікаюцца камуністычнай партыяй, а таксама баўгарскай рабочай партыяй. У шмат-якіх мясцох гораду здарыліся новыя сутычкі паміж паліцыяй і рабочымі. Паранена шмат рабочых. Паліцыя ўчыніла масавыя арышты.

У сувязі з дэманстрацыямі камуністычнай партыі супроць працэсу 52-х камунстых, які пачаўся 21-га лістапада, паліцыя прыняла надзвычайныя меры асьцярогі. Падсудных прыводзяць у суд пад узмоцненай вартай. Увесь раён, дзе знаходзіцца будынак суду, абкружаны паліцыяй. Асобы, што ішлі на суд, ня выключаючы і абаронцаў, старанна абшукваліся. Затрымоўвалі таксама прахожых на вуліцах. З прычыны вялікага ліку абвінавачаных і сьведкаў мяркуюць, што працэс працягнецца каля месяцу.

Лава падсудных--трыбуна

Барацьба з правым ухілам у камуністычнай партыі Польшчы

(З рэзалюцыі Палітсакратарыяту Выканкому Камінтэрну аб становішчы ў КП Польшчы)

Палітсакратарыят з здавальненьнем адзначае вялікія дасягненьні ў галіне кансалідацыі партыі на аснове пастановы X пленуму Выканкому Камінтэрну і VI пленуму КПП. Асноўныя кадры былое большасьці адыходзяць ад былой сваёй фракцыі і згуртоўваюцца з прыхільнікамі былое меншасьці наўкола гэтых пастаноў; рад партыйных і камсамольскіх арганізацый (варшаўская, пазнанская, верхне - сілеская, кракаўская і інш.) палкам і безагаворачна выказаўся за гэтыя пастановы і праводзіць іх у жыцьцё; за гэтыя пастановы выказадася таксама лодзінская арганізацыя; пленумы ЦК КПЗУ, ЦК КПЗБ і ЦК камсамолу выступілі аднадушна супроць правага ўхілу ў КПП і прымірэнцтва з ім. Пераважная большасьць партыі бяз розьніцы ранейшых фракцый асудзіла правы ўхіл тав. Кастржэвы, Стэфанскага, Бранда, выступіўшы самым рашучым чынам супроць спроб некаторых ухілістых сарваць пастановы VI пленуму ЦК.

Палітсакратарыят Выканкому Камінтэрну лічыць, што сыстэма апартуністычных поглядаў тав. Кастржэвы, Стэфанскага і Бранда, сваяцкіх праяўленьням правага ўхілу ў іншых сэкцыях Камінтэрну, складае яго рознавіднасьць у польскіх умовах (недаацэнка контрэвалюцыйнай ролі сацыял-фашызму ў сувязі з няпераможаным поглядам тав. Кастржэвы на самастойную ролю дробнай буржуазіі і з момантамі пераацэнкі капіталістычнай стабілізацыі ў Польшчы, недаацэнка імпэрыялістычнай экспансіі польскага капіталізму на Ўсход, пераацэнка спрэчак у лягеры буржуазіі).

Праўда, т. т. Кастржэва, Стэфанскі і Бранд выступалі ня раз з публічным асуджэньнем правага ўхілу ў іншых сэкцыях КІ (у прыватнасьці у КПГ і ЎсеКП(б), аднак, такая пазыцыя іх у пытаньнях міжнароднай правай, пры адначасовай абароне сваяцкіх гэтай міжнародай правай поглядаў у асноўных пытаньнях КПП, ня толькі не памяншае, але ва ўмовах Польшчы (нарастаньне рэвалюцыйнасьці мас, «левыя» манэўры ППС, нелегальнае становішча партыі, перажыткі фракцыйнасьці ў партыі, якія могуць палягчыць афармленьне фракцыі, і г. д.) яшчэ павялічвае небясьпеку прадстаўленага імі правага ўхілу ў КПП.

Палітсакратарыят рашуча асуджае маневраваньне тав. Кастржэвы перад партыяй і Камінтэрнам, якое выказалася ў яе пісьмовай заяве пасьля VI пленуму ЦК КПП. Гэта заява, якая сьцьвярджае, што раскрытыкаваныя пленумам погляды «былі і зьяўляюцца ёй чужымі», супярэчыць фактам, устаноўленым у рэзалюцыях ня толькі VI пленуму ЦК, але і IV зьезду КПП, а таксама крытыцы памылак т. Кастржэвы ў адкрытым лісьце Выканкому Камінтэрну ад верасьня 1926 г. Гэта заява паказвае, што тав. Кастржэва і яе палітычныя прыяцелі ў ЦК КПП толькі фармальна галасавалі за рэзалюцыю VI пленуму, фактычна застаючыся пры асуджаных пленумам поглядах. Гэта пазыцыя т. Кастржэвы на пленуме ЦК КПП, а таксама выступленьне прыхільніка яе поглядаў тав. Барташэвіча пасьля пленуму стварэньню афармленьня правага ўхілу ў КПП у праную фракцыю для барацьбы супроць партыйнага кіраўніцтва і палітычнай лініі КПП.

Палітсакратарыят Выканкому Камінтэрну падтрымлівае праводзімую ЦК КПП барацьбу супроць правага ўхілу тав. Кастржэвы і яе палітычных прыяцеляў і поўнасьцю ўхваляе рашучы адпор з боку кіраўніцтва КПП усякім крокам, накіраным да стварэньня правай фракцыі і партыі на пляцформе фракцыйных выпадаў супроць адноўленага кіраўніцтва, спробам апартуністычнай верхавіны ўтоесамляць сябе з усёй былой большасьцю, адкрытага або скрытага сабатажу барацьбы з правым ухілам і ўсякіх агаворак у адносінах да пастаноў ЦК.

Гэтыя агаворкі, незалежна ад суб'ектыўных настроеў нізавікоў, якія ўводзяцца ў зман групай Кастржэвы, аб'ектыўна дапамагаюць утварэньню правай фракцыі.

Тую-ж мэту прасьледуюць спробы адцягнуць увагу партыі ад асноўнай небясьпекі ў відзе апартуністычных установак групы тав. Кастржэвы ў бок старых, ужо зжытых памылак прыхільнікаў б. меншасьці. Адцягненьню ўвагі партыі ад сапраўдных карэньняў правага ўхілу спрыяюць таксама зборнікі артыкулаў «На ідэалёгічным фронце», у якіх матар'ял па пытаньні аб «нацыянал-апартунізьме» падабраны тэндэнцыйна і ў якіх т. Варскі па пытаньнях гісторыі партыі ва многім апраўдвае апартунізм ППС лявіцы.

Змагаючыся з усякімі праяўленьнямі прымірэнцтва, ЦК КПП павінен адначасова пакласьці ўсе сілы да таго, каб паглыбленай ідэалёгічнай прапрацоўкай усіх праблем партыйнай палітыкі як у прэсе, так і ва ўсіх партарганізацыях, растлумачыць шырокім масам членаў партыі лінію партыі і ЦК і заваяваць на бок абноўленага кіраўніцтва ўсіх тых таварышоў, якія яшчэ ня зусім усьвядомілі лінію партыі. Трэба поўнасьцю скарыстаць усе сілы партыі, што шчыра стаяць на пункце погляду Камінтэрну і VI пленуму ЦК КПП, нелазёжна ад ранейшай фракцыйнай групоўкі. Трэба побач з гэтым уцягваць у кіраўнічую работу партыі новыя рабочыя кадры асноўных прамысловых цэнтраў Польшчы.

Накіроўваючы галоўны агонь супроць правага ўхілу тав. Кастржэвы і ўтварэньня правай фракцыі, партыя павінна адначасова змагацца супроць усякіх іншых праяўленьняў правай небясьпекі, якія адлюстроўваюць націск дробнабуржуазных элемэнтаў, а таксама супроць ультра-левых тэндэнцый.

Партыя павінна не забываць аб неабходнасьці сваячасовай самакрытыкі ўсякіх памылак, адкуль-бы яны ня выходзілі, і рашучага выкараненьня ўсякіх рэштак фракцыйнасьці, якія затрудняюць кансалідацыю партыі.

Партыя павінна дасягнуць максымальнай згуртаванасьці кіраўніцтва. Патрэбна ўзмацненьне кіраўніцтва ЦК КПП у КПЗУ і КПЗБ.

Палітсакратарыят надкрэсьлівае патрэбнасьць барацьбы з небясьпекай адставаньня партыі ад росту рэвалюцыйнай актыўнасьці мас, у прыватнасьці, спазьненьня партыі ў кіраўніцтве асобнымі забастоўкамі. Небясьпека хвасьцізму, на якую паказаў X пленум Выканкому Камінтэрну, выступае з асаблівай вострасьцю ціпер, калі ў Польшчы на глебе мацнейшага абвастрэньня ўнутраных супярэчнасьцяй капіталістычнай стабілізацыі, эканамічнага і палітычнага крызісу фашызму ўсё шырэй нарастае рэвалюцыйны пад'ём.

Трэба яшчэ больш узмацніць кіраўніцтва забастовачным рухам і барацьбой беспрацоўных, узмацніць і папырыць уплыў у буйных фабрыках і на чыгунках, дабіцца сапраўднага пералому ў рабоце сярод с.-г. рабочых, узмацніць кіраўніцтва ў масавых рэвалюцыйных арганізацыях, узмацніць барацьбу супроць націску фашызму і дробна-буржуазных хістаньняў у гэтых арганізацыях, шырэй паставіць работу ў арміі, дзе партыя зрабіла толькі першыя крокі, зьвярнуць падвойную ўвагу на вылучэньне і ўзьняцьце ідэалёгічнага ўзроўню партыйных кадраў.

Палітсакратарыят зварачае ўвагу ўсёй партыі на неабходнасьць перамогі вялізнай дыспрапорцыі паміж уплывам партыі і яе арганізацыйным ахопам.

У галіне арганізацыйнага ўзмацненьня партыі асабліва ўвагу трэба зьвярнуць на вялікую арганізацыйную слабасьць Верхняй Сілезіі, якая адыгрывае буйнейшую ролю ў падрыхтоўцы вайны супроць СССР.

Ад узьняцьця баяздольнасьці партыі, яе рэвалюцыйнай актыўнасьці залежыць патрэбнае заваяваньне партыяй рашаючае большасьці пралетарыяту і ўзмацненьне яго гегемоніі ў рэвалюцыйным сялянскім і нацыянальна-вызваленчым руху.

Партыйнае будаўніцтва

Узмацніць вярбоўку перадавых рабочых у партыю Леніна

„Трэба ўсямерна скарыстаць магутны ўздым мас у сувязі з праверкай і чысткай партыйных радоў для ўцягненьня ў партыю перадавых рабочых і работніц“

З рэзалюцыі верасьнёўскага пленуму ЦК КП(б)Б

Папаўняем рады партыі

лепшымі рабочымі, калгасьнікамі і беднякамі-актывістымі

У сувязі з праверкай і чысткай партыйных калектываў па прадпрыемствах **Віцебску** разгорнута работа па вярбоўцы новых кадраў перадавых пралетараў у рады партыі. Лепшыя рабочыя і работніцы ад варштату падаюць заявы аб прыёме ў партыю.

На фабрыцы імя **Карла Маркса** ўцягнута ў партыю 17 новых рабочых і работніц ад варштату. Разгорнута вярбоўка сярод рабочых і работніц **Віцебскага** камунальнага трэсту. Многія рабочыя падалі ўжо заявы аб уступленьні ў партыю. Сярод гэтых таварышоў ёсьць рабочы выдаправодчык **т. Клюшкін**, які мае 50-гадовы вытворчы стаж, трамвайны рабочы тав. **Лаўрэнцаў** — па вытворчасьці працуе 32 гады, рабочы т. **Пухаў**, — на вытворчасьці працуе 30 год і інш. На **фанэрным** заводзе ўступіў у партыю актыўны рабкор т. **Савіцкі** — былы батрак.

***

У дні Кастрычніцкай рэвалюцыі на фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** лепшыя рабочыя і работніцы падалі заявы аб прыёме ў партыю. Сярод іх падалі заявы: т. **Саматыга Я.** — былы чырвонаармеец, па вытворчасьці працуе 10 год, т. **Арцюшэнка** — стары прыкладны рабочы, т. **Кальчонак** — старая работніца, працуе 17 год на фабрыцы і г. д.

***

На **Гомельскай** акруговай канфэрэнцыі груп беднаты звыш 20 камунараў, калгасьнікаў, калгасьніц, беднякоў-актывістых і батрачак падалі заявы аб прыёме ў рады партыі. У іх лік уваходзяць наступныя таварышы: **Самоненка, Васючэнка** (калгасьнік), **Каўфман** (бядняк-актывісты, член сельсавету), **Кастрама Н. Л.** калгасьнік), **Купрэйчык** (калгасьнік), **Шматко Е.** (сялянка-бяднячка), **Чаркас А.** (калгасьніца), **Лосеў** (калгасьнік), **Скараход, Ерамеева, Чубарова, Баранава, Арлоў, Грыненка** (камунар), **Сісельсавету**), **Кастрама Н. Л.** (калгасьнік), **Касьцючэнка** (калгасьнік), **Платонаў** і інш.

Праверка ячэйкі „Дрэваапрацоўшчык“

Задачы выкананы

Падрыхтоўка да чысткі забясьпечыла актыўны ўдзел беспартыйных рабочых і работніц.—Перадавыя рабочыя ад варштату ўступаюць у рады партыі

26 лістапада пачалася праверка і чыстка ячэйкі КП(б)Б заводу **«Дрэваапрацоўшчык»**. Ячэйка правяла вялікую падрыхтоўчую работу. Бюро сваячасова разгарнула шырокую агітацыйна-растлумачальную работу па цэхах аб асноўных задачах і палітычных прынцыпах праверкі. Ячэйка цесна ўвязала падрыхтоўчую работу да чысткі з вярбоўкай рабочых у рады партыі. На гэтым фронце партыйная ячэйка дабілася пэўных посьпехаў. 11 лепшых перадавых рабочых ад варштату нядаўна падалі ў бюро ячэйкі заявы аб прыёме ў рады КП(б)Б. «Зьвязда» пісала ўжо аб гэтых таварышох. Зараз ў часе праверкі ячэйкі лепшыя рабочыя падаюць заявы аб уступленьні ў партыю. Падалі ўжо заявы 2 рабочыя ад варштату—т. Каўфман і т. Палойка, якія маюць вялікі вытворчы стаж.

Па прадпрыемстве былі разьвешаны сьветлавыя плякаты і лёзунгі, прысьвечаныя праверцы ячэйкі і вярбоўцы рабочых у партыю.

Усе на сход па чыстцы нашай ячэйкі. Перадавыя рабочыя, ідзеце ў партыю Леніна.

У гэты дзень піянэры заводу «Дрэваапрацоўшчык» былі на нагах ад раніцы аж да вечара. Піянэры напоўнілі цэхі і аддзяленьні заводу лістоўкамі: **«Сёньня пачынаецца чыстка»**, **«Усе на чыстку парт'ячэйкі»**.

Уся гэта падрыхтоўчая работа прынесла відавочныя вынікі. На праверачных сходах прысутнічаюць усе 100 процантаў рабочых і работніц заводу. Рабочыя прымаюць актыўны ўдзел у абмеркаваньні работы бюро і ячэйкі цалкам. Па дакладу сакратара ячэйкі запісалася ў спрэчках больш за 60 чал. Як працавала ячэйка?

Уся работа ячэйкі праходзіла пад знакам выкананьня галоўных задач партыі. Галоўную ўвагу ячэйка зварачала на барацьбу з хістаньнямі ў сваіх радох, з ухіламі ад лініі партыі. Ячэйка ў свой час дала рэзкі руйнуючы адпор вылазкам трацкістых. Усю сваю партыйна-палітычную работу ячэйка прасякнула бальшавіцкай непрымірымасьцю да правага апартунізму, сваячасова і бязьлітасна выкрываючы права-апартуністычныя настроі і хістаньні асобных партыйцаў.

Ячэйка дабілася вялікіх посьпехаў па вярбоўцы новых пралетарскіх кадраў у рады партыі. За год у партыю завербавана 30 лепшых рабочых, з якіх 20 маюць вялікі вытворчы стаж і высокую кваліфікацыю. Праведзена работа па вылучэньні рабочых і работніц на адказную работу. За год на адказную гаспадарчую прафэсыянальную і адміністрацыйную работу вылучаны 23 рабочыя, якія поўнасьцю апраўдалі сваё вылучэньне.

Парт'ячэйка прымала актыўны ўдзел у гаспадарчым жыцьці прадпрыемства. У выніку ёсьць вялікія посьпехі па гаспадарчым узмацненьні заводу «Дрэваапрацоўшчык». З кожным годам расьце і мацнее прадпрыемства. За апошні год значна вырасьлі кадры рабочых. Праводзіцца сыстэматычная выхаваўчая работа сярод новых рабочых і работніц, мабілізуецца іх увага на патрэбнасьці змагацца з прагуламі, бракам, высокім сабекоштам, за інтарэсы сацыялістычнай вытворчасьці. Лік прагулаў на заводзе з кожным днём зьмяншаецца. На сёнешні дзень яны складаюць толькі 0,4 проц. Асобныя цэхі ў першым годзе пяцігодкі значна перавысілі вытворчую праграму. Так, лесапільны цэх выканаў вытворчую праграму на 169 проц. У мэблевым цэху за апошні год прадукцыйнасьць працы ўзьнялася на 31,7 проц.

Завод дабіўся відавочнага зьніжэньня сабекошту прадукцыі. Апрацоўка 1 куб. мэтру зараз каштуе прадпрыемству на 8,35 проц. таней, чым у мінулым годзе. На прадпрыемстве шпаркім тэмпам разгортваецца сацыялістычнае спаборніцтва.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што ячэйка пастаўленыя перад ёю задачы выканала.

С.

Выканаць дырэктывы аб росьце

12-ты зьезд КП(б)Б паставіў перад **Бабруйскай** партарганізацыяй, як і перад усёй КП(б)Б, адказную палітычную задачу. Рост **Бабруйскай** арганізацыі павінен адбывацца **на 80 проц.** за лік рабочых ад варштату, батракоў і с.-г. рабочых. Апошнія пленумы акруговага камітэту партыі яшчэ раз заваструілі увагу партыйнай арганізацыі на практычным ажыцьцяўленьні гэтых дырэктыў. Як-жа на практыцы Бабруйская арганізацыя выконвае дырэктывы аб вярбоўцы? Лічбы і дынаміка росту парт-арганізацыі за 3 кварталы г. г. сьведчаць аб тым, што дырэктывы выконваюцца зусім слаба.

Жорстка рэгулюючы свой сацыяльны склад, арганізацыя дабілася павялічэньня процанту рабочых ад варштату і зьмяншэньня процанту служачых і сялян. Колькасьць служачых зьменшылася з **17 проц. да 14,7**, процант сялян зьменшыўся з **26,5 да 22,5**. Адначасова відавочна вырасла рабочае ядро ў арганізацыі.

Рабочы заводу «Дрэваапрацоўшчык» тав. Каўфман, які ўступіў ў партыю

Рост рабочага ядра тлумачыцца не ўзмацненьнем культурна-масавай работы, не паляпшэньнем палітычнага выхаваньня і г. д., а тым, што арганізацыя амаль спыніла прыём у партыю непралетарскіх элемэнтаў. Тэмп росту арганізацыі невыстарчальны. Аб гэтым сьведчаць наступныя лічбы:

У трэцім квартале сярэдні процант рабочых ад варштату, батракоў і сельгаспрабочых, прынятых у рады партыі, складае **81,2** проц.

Аднак, ня гледзячы на тое, што сярэдні процант поўнасьцю адпавядае дырэктывам пленуму АК аб росьце арганізацыі, дынаміка росту за лік рабочых, с.-г. рабочых і батракоў, прымушае жадаць шмат лепшага. Калі ў першым квартале ў партыю было прынята 260 чал., дык у другім квартале гэта лічба зьменшылася на **12 проц.**, а ў трэцім квартале—**на 52 проц.** Зьніжэньне тэмпу росту арганізацыі якраз мела месца ў тых раёнах, дзе ёсьць прамысловыя прадпрыемствы і пэўныя кадры рабочых і работніц для вярбоўкі ў рады партыі. У **Сьвіслацкім** раёне, дзе ёсьць вялікая база для росту раённай арганізацыі, за тры кварталы прыняты ў партыю толькі... 2 чал., у **Бабруйску** за гэты-ж тэрмін—4, у **Рагачэўскім**—3, у **Асіпавіцкім**—6 і г. д. Зразумела, што такі марудны тэмп росту раённых арганізацый, ня гледзячы на паяўнасьць пэўных кадраў для росту, прымушае біць трывогу. Невыстарчальны тэмп тлумачыцца толькі тым, што арганізацыі слаба разгарнулі палітыка-выхаваўчую работу, што правядзеньне гаспадарча-палітычных кампаній ня ўвязваецца з задачамі вярбоўкі, важнейшыя пытаньні з бягучага жыцьця партыі і савецкай улады не папулярызуюцца сярод рабочае масы і г. д.

Рост раённых арганізацый за лік батракоў таксама праходзіць марудна. У першым квартале прынята ў партыю ўсяго **13** батракоў, у другім квартале—7 і у трэцім квартале—таксама 7 батракоў. Рад раёнаў, як **Чырвона-Слабодзкі, Клічаўскі, Жлобінскі, Старадарожскі і Асіпавіцкі** за апошнія тры месяцы не прынялі ў партыю ні аднаго батрака. Між тым, у гэтых раёнах працуе больш батракоў, чым у іншых мясцовасьцях Бабруйшчыны.

Камсамольская арганізацыя ня выканала дырэктыў бюро і пленуму АК партыі і АК ЛКСМБ аб падрыхтоўцы лепшых камсамольцаў—рабочых і работніц ад варштату, батракоў і с.-г. рабочых для перадачы ў рады партыі. Калі на 1-га студзеня г. г. парт'ядро ў камсамоле складала 36 проц., то на 1-га кастрычніка гэта лічба зьнізілася на **5 проц.**

За апошні час узмацніўся тэмп вярбоўкі ў партыю жанчын-работніц. У выніку агульная колькасьць жанчын у радох арганізацыі вырасла з **9,8 проц.** да **10,7 проц.**

Падагульваючы ўсе гэтыя факты, трэба адзначыць, што ў выніку невыстарчальнага выкананьня дырэктыў бюро і пленуму АК КП(б)Б, агульная колькасьць членаў арганізацыі зьменшылася. Калі на 1-га жніўня арганізацыя складалася з **4.109** членаў і кандыдатаў партыі, дык на 1-га кастрычніка лік арганізацыі зьменшыўся на **5,3 проц.**, да сягнуўшы **3.900 чал.** Раённыя камітэты партыі і ячэйкі спакойна праходзяць міма гэтых трывожных фактаў і слаба разгортваюць практычную работу па выкананьні дырэктыў аб узмацненьні вярбоўкі. Нам здаецца, што з гэткім марудным тэмпамі вярбоўкі трэба пакончыць, трэба максымальна разгарнуць вярбоўку ў рады партыі лепшых рабочых, работніц, батракоў і с.-г. рабочых, каб на практыцы поўнасьцю выканаць дырэктывы аб росьце.

С—н.

Падвоіць тэмпы вярбоўкі

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ ЦК КП(б)Б ПА ДАКЛАДУ АБ РОСЬЦЕ ПАРТКАЛЕКТЫВУ ГАРБАРНІ „БАЛЬШАВІК“

Заслухаўшы даклад тав. **Штэймана** аб выніках росту парткалектыву гарбарні **«Бальшавік»** за 1929 год сакратарыят ЦК канстатуе наступнае:

— Ня гледзячы на тое, што ў росьце парткалектыву ёсьць за апошні час некаторыя дасягненьні, тэмп росту зьяўляецца невыстарчальным таму, што не праводзіцца сыстэматычная і плянавая работа па вярбоўцы новых кадраў у рады партыі. Рост носіць кампанейскі характар. З 1-га студзеня па 1-га ліпеня калектыў вырас на 3 чал., а з 1-га ліпеня па 1-га верасьня—на 39 чал. Асабліва слаба праходзіў рост па асобных цэхах (хромавы і мэханічны).

— Сакратарыят лічыць зусім невыстарчальным рост за лік жанчын і камсамольскага актыву, што тлумачыцца дрэнным становішчам камсамольскай ячэйкі і невыстарчальным кіраўніцтвам ёю з боку партыйнага калектыву.

— Парткалектыў і цэх'ячэйкі КП(б)Б не разгарнулі работу з беспартыйным актывам, са старымі кадрамі рабочых, не паленшылі мэталаў правядзеньня і зьместу масавай выхаваўчай работы.

ЦК канстатуе, што работа па штодзённай вярбоўцы ў партыю не стаяла ў цэнтры ўвагі партыйнага актыву і фракцыі непартыйных органаў.

— З боку асобных камуністых назіраецца недапушчальныя настроі — «расьці няма за лік каго, усе лепшыя рабочыя ўцягнуты ў партыю». З гэтымі настроямі парткалектыў павінен рашуча змагацца.

У далейшым ЦК прапануе:

1. Парткалектыву ўжыць мерапрыемствы па значным узмацненьні тэмпу вярбоўкі ў партыю лепшай і перадавой часткі рабочых, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на якасны адбор таварышоў, якія прымаюцца ў партыю, для чаго:

а) Паставіць задачу перад кожным камуністым, які працуе на вытворчасьці, весьці штодзённую апрацоўку беспартыйных рабочых па ўцягненьні іх у партыю.

б) У кожным цэху арганізаваць гурткі па падрыхтоўцы ў партыю, на якіх прапрацаваць галоўныя пытаньні палітыкі партыі, а таксама пытаньні гаспадарчага жыцьця прадпрыемства.

в) Фракцыям выбарчых органаў, асабліва фабзаўкому ўжыць рашучыя меры па разгортваньні работы па падрыхтоўцы да ўступленьня ў партыю лепшых рабочых-актывістых, якія працуюць у гэтых органах.

г) У цэхах сыстэматычна праводзіць гутаркі са старымі кадрамі рабочых, прыкладнымі на вытворчасьці, актыўнымі ўдзельнікамі сацыялістычнага спаборніцтва (аб росьце партыі, аб больш важных мерапрыемствах партыі і ўрада, аб мерапрыемствах па паляпшэньні гаспадарчага становішча прадпрыемства і г. д.).

д) Шырока разгарнуць работу з беспартыйным актывам, прыцягваць яго ў адкрытыя партсходы, уцягваць у працоўную выхаваўчую грамадзкіх арганізацыі і добраахвотных таварыстваў, а таксама і ў розныя (непартыйныя) камісіі по аглядзе асобных галін работы на прадпрыемстве.

е) Асьвятляць пытаньні вярбоўкі і партыю ў заводзкай шматтыражнай газэце, зьвярнуўшы ўвагу на асьвятленьне ў ёй практыкі работы, групавых арганізатараў і цэхавых ячэек у галіне вярбоўкі ў партыю лепшай, перадавой часткі рабочых.

Сакратарыят ЦК адзначае невыстарчальны рост за лік рабочых-беларусаў і даручае парткалектыву працягваць работу па вярбоўцы ў партыю лепшай часткі рабочых, адначасова зьвярнуўшы сур'ёзную ўвагу на значнае ўзмацненьне работы па ўцягненьні ў партыю рабочых-беларусаў.

Сыстэматычна (паквартальна) склікаць партактыў, абмяркоўваць пытаньні выкананьня, зьмест масавай выхаваўчай работы з беспартыйным актывам, тэмп росту за лік камсамольцаў і жанчын-работніц і г. д.

Перад партыйным ядром камсамола паставіць задачу паляпшэньня ўнутрыпартыйнай выхаваўчай работы ў камсамольскім калектыве ў мэтах уцягненьня лепшых перадавых рабочых-камсамольцаў у рады партыі. Пры гэтым парткалектыву павінен значна палепшыць партыйнае кіраўніцтва камсамольскай арганізацыяй.

Ужыць меры па паляпшэньні работы сярод работніц як у галіне ўцягненьня іх у актыўную работу грамадзкіх арганізацый на прадпрыемстве, так і паляпшэньні зьместу работы дэлегацкага сходу.

Абмеркаваць вынікі росту за 1929 год на адкрытых цэхавых сходах ячэйкі КП(б)Б, завастрыўшы ўвагу на невыстарчальнасьці росту і на шкодніцтвы, думкі аб тым, што няма за лік каго расьці. Склікаць сыстэматычныя нарады групавых арганізатараў па пытаньні росту, заслухоўваючы даклады асобных групоргаў аб выніках іх работы па ўцягненьні беспартыйных рабочых у рады партыі, а таксама і распаўсюджваючы прыкладную практыку і работы ва ўсіх цэхах.

Рыхтуемся да чысткі

Парт'ячэйка **Менскага** хлебазаводу за апошні час стала сур'ёзна рыхтавацца да праверкі сваіх радоў. Пытаньне аб чыстцы шырока абмеркавана на адкрытых сходах ячэйкі і на сходах беспартыйных рабочых і работніц. На гэтых сходах ячэйка пры ўдзеле беспартыйных рабочых абмеркавала калектыўную заяву 8 рабочых аб прыёме іх у рады партыі. Сходы пасьля шырокага і актыўнага абмеркаваньня рэкамандавалі ў партыю наступных таварышоў: **т. Рэціка**—старога кваліфікаванага рабочага, які прымае актыўны ўдзел у грамадзкай рабоце, рабочага **Гэфэна**, які мае вялікі вытворчы стаж, і г. д. Зараз зноў паступіла калектыўная заява ад 2 рабочых аб прыёме іх у партыю. На заводзе арганізаваны гурток па падрыхтоўцы рабочых і работніц да ўступленьня ў партыю. Гэты гурток наведваюць 20 рабочых.

На заводзе разьвешаны транспаранты, плякаты і лёзунгі, прысьвечаныя чыстцы партыі.

Для самаправеркі работы ячэйкі вылучана некалькі груп, якія правераць як ячэйка прымала ўдзел у кіраўніцтве гаспадарчым жыцьцём і камсамольскай ячэйкай, у сацыялістычным спаборніцтве, у барацьбе за зьніжэньне сабекошту і паляпшэньні якасьці прадукцыі і г. д. Нельга не адзначыць, што насьценная газэта, не даволі прымае ўдзел у прыхільнай рабоце да чысткі ячэйкі.

ХОНІК.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

На дапомогу „Юманітэ“

Супрацоўнікі газ. „Зьвязда“ адлічылі аднадзённы заработак у фонд „Юманітэ“

Учора агульны сход супрацоўнікаў рэдакцыі газэты «Зьвязда» заслухаў інфармацыю аб правакацыйным цкаваньні буржуазным урадам Францыі органу францускай камуністычнай партыі — газэты «Юманітэ».

Сход пастанавіў рашуча пратэставаць супроць правакацыйнай палітыкі ўраду Тард'е, які прасьледуе баявы орган францускай кампартыі — «Юманітэ».

Сход вітае гераічную барацьбу францускага пралетарыяту пад кіраўніцтвам францускай камуністычнай партыі.

Сход заклікае ўсіх працаўнікоў газэт БССР узьняць голас пратэсту супроць прасьледаваньня «Юманітэ» і дапамагчы ёй шляхам грашовых адлічэньняў.

Сход пастанавіў адлічыць у фонд дапамогі «Юманітэ» аднадзённы заработак.

Чыстка ячэйкі гандлёва-будаўнічага трэсту.

Сёньня пачынаецца чыстка ячэйкі КП(б)Б гандлёва-будаўнічага трэсту ў клюбе АВК (Пляц Волі 4).

ПРАВЕРКОМ БЮРО ЯЧЭЙКІ.

НА БАРАЦЬБУ ЗА УЗЬНЯЦЬЦЕ ПРАДУКЦЫЙНАСЬЦІ АКАДЭМІЧНАЕ ПРАЦЫ

Аб чарговых задачах Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту

24-га лістапада закончыўся агульны сход усіх факультэтаў БДУ, на якім выключна востра было пастаўлена пытаньне аб стане акадэмічнай працы унівэрсытэту.

Дакладчык т. Рыўлін спыніўся на недапушчальных момантах акадэмічнага жыцьця студэнцтва БДУ.

Да гэтага часу ўся акадэмічная праца ва унівэрсытэце ідзе тэмпам, які зусім не адпавядае тым вялікім задачам, якія пастаўлены партыяй у галіне падрыхтоўкі кадраў. Прадукцыйнасьць працы студэнцтва стаіць на вельмі нізкім узроўні.

І ў той час, як на вытворчасьці за апошні год мы наглядаем вялікі пералом у адносінах прадукцыйнасьці працы, і ўсе партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі вялікую ўвагу аддаюць яе няўхільнаму павышэньню,—у БДУ пытаньне вытворчасьці, пытаньне вучобы, як гэта ня дзіўна, стаіць на другім пляне.

Ніякай барацьбы з прагуламі як з боку студэнцтва, так і з боку выкладчыкаў, не вялося.

Прафэсыянальныя арганізацыі мала цікавіліся пытаньнямі працоўнай дысцыпліны. Партыйныя арганізацыі не аддавалі належнай увагі акадэмічнаму пытаньню. Адсюль наглядаліся такія зьявішчы, як 6-7 галовае навучаньне ў БДУ, як пакіданьне на адным і тым-жа курсе на 3 гады.

Не вялося ніякага ўліку якасьці працы студэнцтва, і унівэрсытэцкія арганізацыі фактычна ня ведалі, каго яны выпускаюць.

Назіраліся такія недапушчальныя факты, калі прафэсура на працягу месяца і больш не наведвала унівэрсытэту, прапускаліся заняткі, зрываліся важнейшыя курсы, сэмінары. Аб спазьненьнях прафэсуры няма чаго і казаць.

З другога боку, праца дэканатаў таксама ня была даволі выразнай. Адвечная блытаніна з галізінамі заняткаў, аўдыторыямі—уся гэта нядбайнасьць вяла да зрыву заняткаў.

Да гэтага часу яшчэ захавалася традыцыя скліканьня сходаў у часе заняткаў. Так, сэкцыя навуковых працаўнікоў назначыла пленум ЦВ сэкцыі з абавязковай прысутнасьцю ўсіх навуковых працаўнікоў Менску ў часе заняткаў. Выбары праўленьня унівэрсытэту па прафэсарскай курыі таксама адбываліся ў галіны заняткаў.

Цэлы рад студэнцкіх сходаў склікаецца ў часе лекцый.

У той час, як на прадпрыемствах такія зрывы мелі месца толькі ў 1918 годзе, (а з таго часу сходы ў момант працы лічацца недапушчальнымі), у мурох Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту мы маем гэта на 1929 год.

Адзін ужо гэты факт выразна гаворыць за тое, што ў БДУ вытворчасьць—вучоба стаіць далёка не на першым пляне.

Найгоршым злом наогул зьяўляецца шматлікасьць сходаў. Ёсьць студэнты, якія кожны дзень маюць які-небудзь сход.

Ясна, што пры такой грамадзкай перагружанасьці поўнае і пасьпяховае выкананьне задач, пастаўленых партыяй перад ВНУ, немагчыма. Трэба зараз-жа дабіцца карэннага пералому ў адносінах акадэмічнай працы.

Барацьба за ўзьняцьце прадукцыйнасьці працы, за рацыяналізацыю навучальнага жыцьця, барацьба з прагуламі павінна стаць важнейшай належнай задачай унівэрсытэцкіх арганізацый, як даўно стала асноўнай задачай заводзкіх арганізацый.

Трэба неаклядна перагледзець усю сыстэму пабудовы кіраўнічых органаў унівэрсытэту, сыстэму пабудовы партыйнай і прафэсыянальнай арганізацыі унівэрсытэту в тым, каб цэнтр цяжару быў перанесены на ніжэйшыя вучасткі БДУ, на аддзяленьні факультэтаў.

Такая зьмена арганізацыйных форм зьяўляецца патрэбнай умовай карэннага пералому ва ўсім унівэрсытэцкім жыцьці.

Трэба, каб Наркамасьветы сапраўды дапамагаў БДУ ў справе выкананьня тых задач, якія пастаўлены перад ім партыяй, і ў першую чаргу прыняў жывы ўдзел у арганізацыі бесьперапыннай практыкі.

Да гэтага часу на пэдфаку пэдпрактыкум пастаўлены ганебна жудасна. Паказальныя школы пастаўлены ў такія ўмовы, пры якіх ня здолее працаваць ні адна школа, тым больш паказальная. І калі гэтым школам ня будзе прадастаўлена памяшканьне унівэрсытэту па Зямляробчым завулку, пэдпрактыкум зноў будзе сарваны і студэнты пэдфаку выйдуць бяз усякай практычнай падрыхтоўкі.

Здавалася-б, што НКА павінен зараз-жа загадаць унівэрсытэту перавесьці паказальныя школы ў гэты будынак, які вызваляецца з пераходам БДУ ва унівэрсытэцкі гарадок. А між тым хадзяць чуткі, што НКА аддае яго пад студэнцкі інтэрнат, строга забараняючы перавод школ. Па гэтым пытаньні Выканбюро, орган, які прадстаўляе 3.000 студэнтаў унівэрсытэту, ухваліла рэзалюцыю, у якой рашуча асудзіла такі мэтад выхаду з крытычнага становішча студэнцтва без інтэрнату за кошт вучобы і практыкі.

Выходзячы з таго, з якім уздымам прайшоў агульны сход, дзе глыбока падышлі да ўсіх гэтых пытаньняў, ёсьць усе падставы думаць, што сапраўды у БДУ вы дачакаліся пералому ў адносінах да вучобы і выкананьня пастаноў апошняга пленуму ЎсеКП(б).

Сход прыняў цэлы рад пастаноў у мэтах неадкладнага ажыцьцяўленьня пастаўленых задач.

Зараз-жа праверыць ход сацыялістычнага спаборніцтва, характар заключаных дагавароў, ступень уцягненьня ў яго студэнцтва і навуковых працаўнікоў.

Прапанаваць фракцыі Выканбюро, фракцыям прафкомаў распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы па ўзьняцьці працоўнай дысцыпліны сярод студэнцтва, у барацьбе з прагуламі, манкіраваньнем заняткамі і г. д.

Катэгарычна забараніць фракцыям унівэрсытэцкіх арганізацый склікаць якія-б там ні было сходы ў часе заняткаў. Давесьці аб гэтай пастанове да ведама фракцыі ЦБ сэкцыі навуковых працаўнікоў.

Прапанаваць фракцыям прафкомаў разам з дэканатамі на працягу 5 дзён арганізаваць вучот прысутнасьці на лекцыях, групавых і сэмінарскіх заняткох і практыкумах.

І даручыць працаўніком дэканатаў—партыйцам у 5-дзённы тэрмін наладзіць вучот наведваньня заняткаў усіх навуковых працаўнікоў.

Прапанаваць фракцыям прафкомаў разам з дэканатамі на працягу 5 дзён арганізаваць вучот прысутнасьці на лекцыях, групавых і сэмінарскіх заняткох і практыкумах.

І даручыць працаўніком дэканатаў—партыйцам у 5-дз

Недапушчальна павольна ідзе падрыхтоўка да будаўніцтва 1929-30 г.

Усе тэрміны даўно прапушчаны

Ня гледзячы на цэлы рад пастаноў Эканомнарады БССР аб свячасовай падрыхтоўцы да будаўнічага сэзону на 1929-30 год, будаўнічыя арганізацыі амаль што ня выконваюць гэтых пастаноў.

Усе тэрміны, якія былі вызначаны Эканомнарадай БССР на падрыхтоўку да будаўнічага сэзону, прапушчаны. Некаторыя арганізацыі, што будуюць, і да гэтага часу ня ведаюць усіх аб'ектаў будаўніцтва, якія вызначаны для выканаўня ў 1929-30 годзе.

Мы зараз, напрыклад, ведаем, што амаль усе будуючыя і будаўнічыя арганізацыі яшчэ да гэтага часу дакладна ня ведаюць сваіх аб'ектаў будаўніцтва. Амаль поўнасьцю адсутнічаюць праекты на прызначаныя пабудовы. Апрача гэтага, усе будаўнічыя і будуючыя арганізацыі зусім не падрыхтаваны да замацаваньня за сабою вямельных вучасткаў пад пабудовы. Такое становішча прымушае будаўнічыя арганізацыі звозіць усе будаўнічыя матар'ялы на агульны склад, а пасьля развозіць іх на месцы.

Для таго, каб лепш уявіць падрыхтоўку да будаўнічага сэзону (у справе складаньня праектаў на пабудовы, без чаго выконваць пабудовы, зразумела, немагчыма), возьмем для прыкладу некаторыя акругі. Так, у Барысаўскім аддзяленьні Белдзяржбуду заказчыкі прадставілі праекты толькі на 20 проц. таго, што павінна быць пабудавана, у Бабруйскім — 25 проц., у Віцебскім — 33,3 проц. і ў Гомельскім — 33,4 проц.

Такое-ж самае прыблізна становішча і ў іншых будуючых і будаўнічых акруговых арганізацыях. Так, напрыклад, ВСНГ на запытаньне, як праходзіць падрыхтоўка будаўнічага сэзону, адказаў, што вядома будзе толькі праз 10 дзён, а зараз адказу яны даць ня могуць. Пры гэтым трэба адзначыць, што апарат ВСНГ і да гэтага часу для ўрэгуляваньня будаўніцтва не ўкамплектаваны.

Слаба праходзіць падрыхтоўка да будаўнічага сэзону і ў Белсельбудзе. Тое, што Белсельбуд, як будаўнічая арганізацыя, яшчэ канчаткова не аформлен у арганізацыйным сэнсе, ставіць будаўніцтва пад пагрозу зрыву. Тэхнічэсанал адсутнічае, а гэта не дае магчымасьці падрыхтоўваць да будаўнічага сэзону. З прычыны гэтага, Белсельбуд толькі зараз прыступае да распрацоўкі стандартнага праектаваньня будаўніцтва (тыповыя праекты). Такое становішча Белсельбуду ў порыяд шпаркага росту калгасаў недапушчальна. Трэба заразжа зрабіць усе неабходныя захады да таго, каб афармленьне і далейшае разгортваньне работы Белсельбуду ішло фарсаваным тэмпам.

Падрыхтоўка да выкананьня будаўнічага пляну ў 1929-30 г. ідзе недапушчальна павольным тэмпам. Органы, якія рэгулююць усімі будаўнічымі работамі, павінны зараз-жа праверыць і высьветліць, хто вінаваты, хто замаруджвае тэмп падрыхтоўкі да будаўнічага сэзону.

М. ШЫРКО.

Абсьледваньне дало штуршок для паляпшэньня аховы працы

З мэтаю дакладнага выяўленьня стану аховы працы на буйнейшых прадпрыемствах, Мазырская акруговая інспэкцыя працы наладзіла абсьледваньне ўсіх гэтых прадпрыемстваў.

Згодна пляну ў гэту работу ўцягнуты шырокія масы рабочых.

На кожным прадпрыемстве былі вылучаны спэцыяльныя брыгады. Так, на заводзе «Чырвоны Кастрычнік» у брыгаду ўвайшло 18 чалавек, на лесапільным заводзе «Праца» — 9 чал., на фанэрным заводзе «Зьвязда» — 20 чал., на лесапільні «Пралетары» — 23 чал. і г. д. Прымала ўдзел у абмеркаваньні вынікаў абсьледваньня да 100 чалавек, якія давалі дзелавыя канкрэтныя прапановы аб вынішчэньні знойдзеных дэфектаў у ахове працы.

Кажучы аб дэфектах, трэба адзначыць, што іх выяўлена досыць шмат. Так, на фанэрным заводзе «Зьвязда» ёсьць значнае павялічэньне колькасьці няшчасных выпадкаў (за 5 месяцаў — 91 выпадак), на фанэрнай фабрыцы «Чырвоны Кастрычнік» за 4 месяцы 47 выпадкаў. Гэта тлумачыцца толькі слабой растлумачальнай працай пра тэхніку бясьпечнасьці.

Побач з гэтым трэба адзначыць, што на заводзе «Зьвязда» ўхвалена пастанова аб прыцягненьні вінаватых да адказнасьці. У часе абсьледваньня выяўлена, што і санітарнае становішча заводу не на вышыні (заводы «Зьвязда», «Пралетары», «Чырвоны Кастрычнік»). Гразь, цеснота, адсутнасьць перагатаванай вады і інш. — звычайная зьява. У цэлым радзе прадпрыемстваў ня выдана поўнасьцю спэцвопратка. Дагавары на правядзеньне мерапрыемстваў па ахове працы поўнасьцю і да тэрміну ня выкананы (асабліва на заводзе «Зьвязда», «Пралетары» і «Чырвоны Кастрычнік»).

Ёсьць выпадкі парушэньня калектыўных дагавароў. Дрэнна абстаіць справа і з медычнай дапамогай рабочым як у амбуляторыях, так і ў аптэчках пры заводах. Вельмі дрэнна абстаіць пытаньне з кватэрамі для рабочых пры заводзе «Праца». На заводзе «Зьвязда» не распрацаваны і ня вывешаны правілы ўнутранога распарадку.

Для зьнішчэньня ўсіх гэтых ненармальнасьцей зроблены самыя катэгарычныя папярэджаньні і вызначаны поўны тэрмін.

Наогул трэба адзначыць, што праведзенае абсьледваньне прадпрыемстваў Мазырскай акругі ўскалыхнула шырокія масы рабочых і па сваім характары зьяўляецца першым шырокім абсьледваньнем.

Усе рабочыя і ўся пралетарская грамадзкасьць і, у першую чаргу, органы працы і прафсаюзы павінны дабіцца ад адміністрацыі поўнага і бясспрэчнага ажыцьцяўленьня ўсіх патрабаваньняў у справе аховы працы.

Рабкор.

Беларускі вандроўны тэатр прыняў шэфства над вёскай Лошніца

Беларускі вандроўны тэатр вярнуўся з паездкі ў вёску Лошніца, Барысаўскага раёну, куды ён быў накіраваны для правядзеньня антырэлігійнай кампаніі. На пастаноўках тэатру прысутнічала каля 2.000 сялян. Сяляне зараз узьнялі пытаньне аб перадачы існуючай царквы пад тэатр. Вандроўны тэатр прыняў культурнае шэфства над вёскай.

Калдагаворная кампанія пад пагрозай зрыву

НА НАРАДЗЕ ПРЫ ЦСПСБ

Пры АТЭ ЦСПСБ адбылася нарада ЦП прафсаюзаў па пытаньні аб ходзе калдагаворнай кампаніі.

На нарадзе высьветлілася, што падрыхтоўка да перазаключэньня калдагавароў праходзіць вельмі дрэнна. Многія саюзы ня выканалі дырэктывы аб сканчэньні падрыхтоўкі да 1-га лістапада. Ня выканана таксама дырэктыва ЦСПСБ аб плянавым разьмеркаваньні адказных працаўнікоў для абслугоўваньня месц. ЦП саюзу дрэваапрацоўшчыкаў толькі сёньня ставіць пытаньне аб калдагаварох на нарадзе старшынь акруговых праўленьняў саюзаў.

Многія прафсаюзы яшчэ не разаслалі праектаў дагавароў для абгаварэньня іх на масавых рабочых сходах. Наогул, рабочая маса не мабілізавана вакол пытаньняў калдагаворнай кампаніі. Асабліва дрэнае становішча па саюзах дрэваапрацоўшчыкаў, друкароў, харчавікоў і нархарч.

Нарада прапанавала ўсім ЦП мабілізаваць усе сілы для свячасовага перазаключэньня калдагавароў.

Нарада вырашыла паставіць пытаньне аб ходзе калдагаворнай кампаніі на нечарговым пасяджэньні прэзыдыуму ЦСПСБ.

Капя Бабруйску выкрыта крыніца мінэральных вод

Выезд экспэдыцыі Беларускай Акадэміі Навук

Каля Бабруйску пры капаньні студні выкрыта крыніца саляных вод. Аналіз паказаў, што на 1 літар вады прыходзіцца 15 грамаў солі. Крыніца можа быць скарыстана для лекавых мэтаў.

Беларуская Акадэмія Навук разам з інстытутам санітарыі і гігіены ў тэрміновым парадку камандыравалі экспэдыцыю ў Бабруйшчыну для геалёгічных досьледаў.

БССР — на выстаўцы друку нацыянальнасьцяй усяго сьвету

У Баку арганізавана выстаўка друку нацыянальнасьцяй усяго сьвету. На выстаўцы прадстаўлены друк 182 краін на 147 мовах — у паўтара разы больш, чым на міжнародным выстаўцы друку ў Кёльне ў 1928 годзе. Зараз выстаўка рэарганізуецца ў перасоўку і наведае рад гарадоў СССР.

Выставачны камітэт зьвярнуўся ў Беларускую Акадэмію Навук з прапановай прыняць удзел у выстаўцы і прысласць экспанаты беларускага друку. Акадэмія Навук прапанову прыняла.

СУД

Справа аб самагубстве тэлефаністкі Шаўчэнка

У свой час у газэце «Зьвязда» пісалася аб самагубстве тэлефаністкі Гомельскага тэхнічнага вучастку «Водапуці» Н. Шаўчэнка, якая выкінулася з 3-га паверху і праз 10 дзён памерла.

Сьледствам устаноўлена, што начальнік тэхнічнага вучастку Захараўскі і старшыня мясцкому Сухарукаў прымушалі тэлефаністку Шаўчэнку ўступаць з імі ў інтымную сувязь, а калі Шаўчэнка дала ім рашучы адпор, то Захараўскі і Сухарукаў дабіліся яе звальненьня з працы. У выніку такіх адносін да сябе Шаўчэнка і пакончыла жыцьцё самагубствам.

Гомельскі акруговы суд, дзе разглядалася гэта справа, знайшоў вінаватымі Захараўскага і Сухарукава ў самагубстве Шаўчэнкі і прыгаварыў першага на 3 гады, а другога — на 1 год зьняволеньня.

Вярхоўны суд, разглядзеўшы гэту справу ў касацыйным парадку, знайшоў, што важныя па гэтай справе акалічнасьці судовым сьледствам ня былі дакладна высьветлены і таму прыгавар акрсуду скасаваў.

Улічваючы грамадзкае значэньне гэтае справы, Вярхоўны суд прыняў яе да свайго разгляду.

30-га лістапада справа аб самагубстве тэлефаністкі Шаўчэнка будзе разглядацца выязной сэсіяй Вярхоўнага суду ў гор. Гомелі пад старшынствам члена Вярхоўнага суду т. Шапіра.

Стагодзьдзе з дня сьмерці кампазытара А. Г. Рубінштэйна

29-га лістапада 1929 г. мінула 100 год з дня нараджэньня вялікага музыкі-піяністага і кампазытара пэдагога Антона Грыгор'евіча Рубінштэйна. Дзейнасьць яго ў гісторыі музыкі займае пачэсную старонку.

А. Г. Рубінштэйн сваёй дзейнасьцю зрабіў наступнае:

1) Арганізацыя вядомага «Русского музыкального общества», якое пакрыла Расію сеткай (выстарчальнай, зразумела, толькі для буржуазіі і інтэлігенцыі) музычна навучальных устаноў, ён прыцягнуў да працы ў музычнай галіне новыя шырокія пласты грамадзтва.

2) Ён нанёс рашучы ўдар ранейшаму панаваньню дылетантызму, аматарства.

3) Ён стварыў новую клясу музыкаў-прафэсыяналаў, для якіх музыка ёсьць адзіны заработак і сродак жыцьця.

4) У ранейшыя чыста нацыяналістычныя музычныя плыні ён уліў плыні музыкі заходня - эўрапейскае. У апошніх адносінах сынтэзам працэсаў, якія адбываліся да Рубінштэйна, і тых, на чале якіх стаяў ён, зьяўляецца дзейнасьць двух галоўнейшых «слупоў» расійскае музыкі, Чайкоўскага і Рымскага-Корсакава, з якіх першы быў выхаванцам заснаванае Рубінштэйнам Ленінградзкае кансэрваторыі ды вучнем самога Рубінштэйна, а Рымскі адначасова прафэсарам і вучнем тэй-жа кансэрваторыі.

Заснаванае ім «Русское музыкальное общество» ролю сваю гістарычную, зразумела, адыграла і, як таварыства чыста буржуазнага характару, цячэр ня існуе, але пашырэньне музыкі на ўсім абшары нашага Саюзу вядзе свой пачатак ад А. Рубінштэйна. Сталымі помнікамі дзейнасьці А. Рубінштэйна і яго брата зьяўляюцца заснаваныя імі Ленінградзкая і Маскоўская кансэрваторыі.

Ю. ДРЭЙЗІН.

Напярэдадні мастацкаи выстаўкі

У культурна-сацыяльным сэктары Ўсебеларускай выстаўкі 1930 году будуць шырокая экспанаваны толькі галіны масавага мастацтва — радыё і кіно (вытворчасьць апошняга будзе паказана ад моманту здымкаў да мантажу фільму).

Азнаёміцца з мастацкімі дасягненьнямі тэатру і наогул мастацкіх устаноў Беларусі можна будзе шляхам наведваньня спэктаклю, кіно-сэансаў і іншых мастацкіх відовішч, якія будуць прыстасаваны якраз да часу выстаўкі.

Так у галіне музыкі музэтэхнікум зараз працуе над беларускаю сюітаю, якая напісана музыкай Рыгорам Пукстам. Сюіта будзе праслухана спачатку перад спэцыяльна запрошанай аўдыторыяй. Калі-ж яна ажакажаца здавальняючай, то будзе выконвацца і публічна. Сюіта пойдзе пад назваю «Сымон Музыка».

Адначасова Музэтэхнікум працуе над афармленьнем опэры «Сэвільскі цыруль нік», якая пойдзе ў сьнежні месяцы ў канструкцыйна-мастацкім афармленьні мастака Марыкса. Пераклад тэксту зроблены Ю. Дрэйзіным з першатвору і ў гэтым мае сваё значэньне.

У галіне выяўленчых мастацтваў: пры культ. аддзеле ЦСПСБ адбылося некалькі нарад, зьвязаных з задачамі мастацкага абагачэньня нашага быту.

У Віцебскі мастацкі тэхнікум адным з мастацкіх выкладчыкаў запрошаны В. Руцай, які скончыў у гэтым годзе Маскоўскі Вхутэмас і вядомы ў БССР па яго ўдзеле ў трох беларускіх выстаўках.

На 9-га сьнежня Галоўмастацтва склікае спэцыяльную нараду ўсіх мастацкіх арганізацый (тэатр, кіно, мастакі, пісьменьнікі) для выпрацоўкі канкрэтнага пляну папулярызацыі асноў нашай пяцігодкі шляхам мастацкіх мерапрыемстваў.

„НОВЫ ГОРАД"

«Новы Горад» бадай што найлепшае з катэгорыі так званых хранікальных і культурных фільмаў, якія Белдзяржкіно выпусьціла ў сьвет за ўвесь час свайго існаваньня. Ня будзе вялікім перабольшваньнем, калі сказаць, што гэты кароткаметражны фільм больш карысны і каштоўны, чым многія з выпушчаных Белдзяржкіно мастацкіх карцін, у якасьці якіх можна сумняваць.

Гэты ў асноўным удалы вопыт стварэньня маладымі прапаўвікамі суцэльнай па тэме хранікальна-культурнай фільмы заслугоўвае, каб на ёй спыніцца падрабязна. Перад рэжысэрам (Найдзіч) была задача паказаць вырасшы ва ўмовах пралетарскай дыктатуры Гомель, падкрэсьліць карэнныя зьмены ў быце, якія адбыліся ў гэтым былым павятовым гарадку на 13-м годзе Кастрычніка, адлюстраваць тую ролю і значэньне, якую адыгрывае Гомель у сувязі з далучэньнем яго да БССР. Калі прыняць пад увагу абмежаванасьць мэтражу фільмы, дык трэба прызнаць, што ўвогуле гэта задача выканана добра. Амаль бездакорна зроблена першая частка, якая дае ўяўленьне аб агульных дасягненьнях савецкага Гомелю, гэтага буйнейшага пралетарскага цэнтру ў Беларусі, які разьвіваецца з кожным годам. Матар'ял у гэтай частцы ня толькі ўдала выбраны, але арыгінальна і пераканаўча паказаны. Вялікае ўражаньне робіць рабочае жыцьлёвае будаўніцтва, якое шмат выйграе на фоне асабліва рэзка падкрэсьленых старых руін. Даюцца выключна факты, якія ўпэўніваюць глядача ў тым, што сапраўды на мірае стары брудны «гандлёвы» горад, што ў яшчэ хутчэйшым тэмпам расьце новы, беларускі індустрыяльны цэнтр.

Некалькі горшая другая частка, якая адлюстроўвае чыста прамысловыя дасягненьні. Вінавата ў гэтым, зразумела, ня меншая колькасьць аб'ектаў для здымкаў, а адсутнасьць такой-жа прадуманасьці дэталяй, якая адчуваецца ў першай частцы. Пры здымцы і мантажы другой часткі ў рэжысэра, як відаць, не хапіла цярплівасьці да канца клапаціцца і выразна паказваць рэчы, выпукляючы на першы плян выгодныя ў кінэматаграфічных адносінах важнейшыя дэталі. Здолеў-жа ён, лаючы будаўніцтва асобнымі кавалкамі, упэўніць глядача ў вялізарнасьці і прыгожасьці будоўлі!

Самае няўдалае — канец фільмы, які фактычна выпадае з агульнага пляну.

Ёсьць наяўныя злоўжываньні крывымі кадрамі, вельмі ўжо надакучае паказ ракі Сож у сьветлую ноч. Да недахопаў трэба таксама аднесьці поўную адсутнасьць нават намёку на грамадзка-палітычнае жыцьцё рабочых мас Гомелю.

Трэба па паслугах адзначыць працу кіно-апэратараў. (Кальцаты, Райхальсон). Першая частка зьнята амаль бездакорна. Выразная фатаграфія. Зьнята проста, але разам з тым і арыгінальна. Горшая праца апэратараў у другой частцы. Тут шмат шэрых кадраў.

Зазначаныя недахопы не абясьпечваюць гэтай, бязумоўна добрай і каштоўнай, фільмы. Глядзіш яе вельмі лёгка і нават з захапленьнем. Гэта лішні раз даказвае, наколькі насьпела патрэбнасьць у масавай вытворчасьці культурных і хранікальных фільмаў, наколькі глядач цікавіцца сацыялістычнай перабудовай краіны.

Трэба толькі ўмела і з замілаваньнем ствараць такія фільмы.

Л.

Вышла друкаваная газэта БДУ

Гэтымі днямі выйшаў першы нумар друкаванай шматтыражнай газэты калектыву выкладчыкаў і студэнтаў Белдзяржуніверсытэту «Ленінскім шляхам». Газэта будзе выходзіць два разы ў месяц.

Калі Жакт спыніць зьдзекі?

Работніца шчаціннай фабрыкі Заксхая ўжо каля 3-х год жыве з сям'ёй (4 чалавекі) у маленькім (1 квадр. сажань) пакойчыку-каморцы. Дзеці сьпяць на падлозе, бо няма, дзе паставіць ложка. Сама-ж работніца, прышоўшы з працы, ня мае магчымасьці нават адпачыць. ЖАКТ № 3 на працягу 3-х год на просьбы работніцы даць кватэру адказвае: «заўтра».

Дакуль-жа ЖАКТ № 3 будзе «частаваць» работніцу «заўтракамі».

Белбюро Гандлевае СКЛІКАЕ

АГУЛЬНЫ СХОД СУПРАЦОЎНІКАЎ МЦРК

в наступным парадкам дня: 1. Даклад Праўленьня МЦРК аб выніках гаспадарчага году (даклад ст. праўленьня тав. Кац) і судакład Цэнтр. Эканомбюро МЦРК (даклад і судакład будуць увязаны в выкананьнем дагавору па сац. спаборніцтве і рацыяналізатарскага мінімуму).

Сход адбудзецца ў памяшканьні клюбу Саўгандальслужачых 30 лістапада роўна а 8 гадз. увечары. Усе супрацоўнікі, якія ў гэты час не працуюць — паніны зьявіцца на сход без спазьненьня. — Пажадана, каб прысутнічалі прадстаўнікі прэсы.

БЕЛБЮРО ГАНДЛ. СЭКЦЫІ.
ПРАЎЛЕНЬНЕ МЦРК.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

Дом пісьменьнікаў. У суботу, 30-га лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары ў Доме Пісьменьніка адбудзецца гарадзкая канферэнцыя рабкораў, рабочых, вучняў і студэнтаў, якія друкуюць літаратурныя рэчы ў газэтах і насьценных газэтах, альбо маюць літаратурныя працы. **Парадак дня:**

1. Задачы яўрэйскай пралетарскай літаратуры (дакл. Апаровіч).
2. Справаздача часопісі «Штэрн» (дакладчык Дунец).
3. Бліжэйшыя задачы ў масавай працы яўсэкцыі БелАПП'у (кансультацыя пачынаючых пісьменьнікаў, літаратурныя гурткі, кіраўніцтва рабкорамі, якія выявілі здольнасьць да літаратурнай творчасьці).

На канферэнцыю запрашаюцца пісьменьнікі г. Менску.

Пасьля канферэнцыі літаратурная частка з удзелам усіх сэкцый БелАПП'у.

Дом Камасьветы імя Карла Маркса. 1. Сёньня, а 7 гадзіне ўвечары ў габінэце партработы адбудуцца заняткі антырэлігійнага сэмінару па 2-й тэме. Яўка ўсіх кіраўнікоў антырэлігійных гурткоў абавязкова.

2. АПА Менскага акругкому паведамляе, што ў панядзелак, 2-га сьнежня, а 7 з паловай гадз. увечары ў Доме Камасьветы адбудзецца даклад Наркамасьветы т. Платуна для нізавога актыву на тэму:

«Праблема кадраў народнае гаспадаркі». Пасьля дакладу — мастацкая частка.

Білеты па парт'ячэйках і ў Доме Камасьветы (пакой № 2).

Клюб саўгандальслужачых. 30-га лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары — арганізацыйны сход вайсковага гуртка жаночай групы.

Дом Асьветы. Сёньня, а 7-й гадзіне ўвечары адбудзецца агульны сход усіх пэдпрацаўнікоў разам з асьветнікамі гор. Менску.

На абвестцы дня даклад тав. Мазура аб падручніках для масавых школ.

Райшэфпраўленьне Кастрычніцкага раёну паведамляе, што 30-га лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні райкому склікаецца інструкцыйная нарада таварышоў, вылучаных выканбюро шэфтаварыства для працы на вёсцы тэрмінам на 2 тыдні. Парадак дня:

1. Прадстаўчая праца на вёсцы;
2. Аб дапамозе КСУ.

Яўка ўсіх абавязкова і без спазьненьня.

Прафком мэдфаку і мясцком БДУ склікаюць 1-га сьнежня, а 2-й гадзіне дня сход студэнтаў навуковых і тэхнічных працаўнікоў.

Парадак дня: 1. Даклад т. Рыўліна аб сацыялістычным спаборніцтве; 2. Інфармацыя дэканату аб выніках акадэмпасьпяховасьці за 1928-29 навучальны год; 3. Абгаварэньне ўмоў сацыялістычнага спаборніцтва паміж мэдфакам БДУ, з аднаго боку і мэдфакам Смаленскага універсытэту і Беларускім дзяржаўным вэтэрынарным інстытутам — з другога.

Яўка абавязкова і без спазьненьня.

Клюб «Чырвоны Будаўнік». У суботу, 30-га лістапада, а 6 гадзіне ўвечары ў малой залі клюбу «Чырвоны Будаўнік» адбудзецца сход работніц і жонак рабочых будаўнікоў.

Парадак дня: 1. Аб падрыхтоўцы да чысткі партыі; 2. аб арганізацыі санітарнага гуртка.

Бібліятэка клюбу «Чырвоны Будаўнік» даводзіць да ведама ўсіх членаў саюзу будаўнікоў і чытачоў, што бібліятэка з 1-га сьнежня будзе адкрыта штодзённа з 6-10 гадзін увечары.

Старым падпісчыкам трэба прыняць саюзныя кніжкі для перарэгістрацыі.

Пушкінская бібліятэка. 1-XII а 10-й гадзіне раніцы пасяджэньне бібліятэчнай рады Пушкінскай бібліятэкі.

Парадак дня: 1. Аб рабоце перасовачнага фонду.

2. Зацьвярджэньне пляну працы перасовачнага фонду.

3. Рознае.

На бібліятэчную раду запрашаюцца перасовачнікі, кіраўнікі і прадстаўнікі (у бібліятэчную раду) чытачы.

Прысутнасьць загадчыкаў аддзелаў бібліятэчных аддзяленьняў і загадчыкаў прыгарадных хат-чытальняў абавязкова.

30-га лістапада, 1-га і 2-га сьнежня ў памяшканьні ЦП саюзу Працасьветы з 2-х да 4-х гадзін дня адбываецца перарэгістрацыя пайшчыраў МЦРК — беспрацоўных членаў саюзу Працасьветы. Непрайшоўшыя перарэгістрацыі ня будуць унесены ў спіс на атрыманьне талёнаў.

Дэманстрацыя рабочай моладзі, прысьвечаная канферэнцыі ўдарнікаў, адбудзецца 1-га сьнежня, а 5 гадзіне ўвечары. Усе ячэйкі КСМ разам з рабочай моладзьдзю зьбіраюцца а 5 гадзіне ўвечары ля будынку РК з сьцягамі, лёзунгамі, плякатамі і аркестрамі.

Дом Асьветы. Сёньня — даклад т. Мазура аб падручніках для 7-мігадовых школ. Пачатак а 8-й гадзіне ўвечары.

Клюб навуковых працаўнікоў. Сёньня, а 8 з паловай гадзіне ўвечары — агульны сход навуковых працаўнікоў. Будзе зроблены даклад прафэсарам С. Я. Вальфсонам на тэму: «Рэарганізацыя ВНУ ў сувязі з рэканструкцыяй народнае гаспадаркі».

Адказны рэдактар ЯН. АСЬМОЎ.

Праўленьне і Мясцком Беларускага Дзяржаўнага Універсытэту выказваюць сваё спачуваньне сям'і памёршага супрацоўніка Універсытэту

тав. ЯРАШЭВІЧА С. А.

ПРАЎЛЕНЬНЕ І МЯСЦКОМ БДУ.

Праўленьне і Мясцком Беларускага Дзяржаўнага Універсытэту паведамляюць аб нечаканай сьмерці супрацоўніка універсытэту

тав. ЯРАШЭВІЧА С. А,

якая здарылася 29 лістапада г. г.

Пахаваньне адбудзецца сёньня, 30 лістапада, а 3 гадз. дня на вайсковых могілках. Выход цела рог Універсыт. і Чырвонаармейскай (будынак Рабфаку).

ТЭАТР і КІНО

Дзяржаўны Яўрэйскі Тэатр БССР

Субота, 30 лістапада. АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ. Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру. Д. Бэргельсон. **ГЛУХІ**

Нядзеля 1 сьнежня. АДКРЫТЫ СПЭКТАКЛЬ. Білеты ў рабочай касе і ў касе тэатру. Ц. Даўгапольскі. **Барацьба машын**

Пачатак спэктакляў роўна а 8 г. 30 м.

ДОМ АСЬВЕТЫ. НЯДЗЕЛЯ, 1 СЬНЕЖНЯ. Спэктакль Бел. Дзярж. Тэатру пад кіраўн. ГАЛУБКА. **ПРАВАКАТАРЫ** у 5-ці актах.

Папярэдні продаж білетаў у касе Дому з 12—2 і з 6—10 г.

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА. Бытавая камэдыя з пралёгам **ПАБОЧНАЯ ЖАНЧЫНА**. Звыш праграмы культфільм у 2-х част. вытворч. БЕЛДЗЯРЖКІНО **НОВЫ ГОРАД** (ГОМЕЛЬЩЧЫНА) Рэж. НАЙДЗІЧ. Пачатак роўна а 7 г. увеч. Каса — ад 5 г.

КІНО ІНТЭРВАЦЫЯНАЛ. ВЫКЛЮЧНА МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **ЧОРНЫ ПАРУС**. Драма ў 6 частках. Звыш праграмы хроніка „Совкино" № 65. Пачатак 1 сэансу а 7 г. — каса — ад 5 г.

КІНО ПАЛЕТАРЫ. 2-гі ТЫДЗЕНЬ 2-гі. БЭСТЭР КІТОН у амэрыканскай камэдыі **ГЕНЭРАЛ** у 7 частках. Пачатак — а 7 г. увеч. Каса — ад 5 з пал. г.

1-шы дзіцячы кіно-тэатр „Юны Піянэр". **Янка і мсьцівец** у 6 частках. У галоўных ролях В. Нольмэн і дрэсыраваная нямецкая аўчарка Тасса. Каса адчынена штодня ад 2 гадз. дня.

КІНО СПАРТАК. Выдатны амэрык. трука-прыгодніцкі фільм **Жанчына сышчык** («ПАНОПТА») у 8 част. Пачатак а 6 гадз. Каса — ад 5 гадз.

РЭЙКІ ГУДУЦЬ...

Прыймо абвестак у чарговы нумар газэты да 2 гадзіны дня

24 КНИГИ САМЫЙ РАСПРОСТРАНЕННЫЙ **ОГОНЕК** ИЛЛЮСТРИРОВАННЫЙ ЖУРНАЛ **24 КНИГИ**

В 1930 ГОДУ ДАЕТ СВОИМ ПОДПИСЧИКАМ 24 КНИГИ

БИБЛИОТЕКА РОМАНОВ

В ДВАДЦАТИ ЧЕТЫРЕХ КНИГАХ БУДУТ ДАНЫ ЛУЧШИЕ ПРОИЗВЕДЕНИЯ МИРОВОЙ ЛИТЕРАТУРЫ РАЗЛИЧНЫХ ЭПОХ и НАРОДОВ

Свифт.—Сказка о бочке. **Теофиль Готье.**—Капитан Фракас. **Виктор Гюго.**—Труженики моря. **Анатоль Франс.**—Боги жаждут. **Стендаль.**—Пармский монастырь. **Э. Золя.**—Деньги. **Э. Золя.**—Разгром. **Бальзак.**—Крестьяне. **Генрих Манн.**—Верноподданный. **Де-Костер.**—Тиль Уленшпигель. **Ромэн Роллан.**—Колэ Бреньон. **Додэ.**—Тартарен из Тараскона. **Лесаж.**—Жиль Блаз. **Фаррер.**—Фома Ягненок. **Вассерман.**—Каспар Гаузер. **Мопассан.**—Монт Ориоль. **Энсворт.**—Уот Тейлор. **Е. Блох.**—Эрих 99-й. **Флобер.**—Мадам Бовари. **Валлес.**—Инсургент. **Диккенс.**—Записки Пиквикского клуба. **Люсьен Декав.**—Колонна. **Революционная поэзия XIX века от Поль Луи Курье до Верхарна. Революционная поэзия современных поэтов Запада**

под общей редакцией **М. ГОРЬКОГО**

УСЛОВИЯ ПОДПИСКИ НА „ОГОНЕК" С ПРИЛОЖЕНИЯМИ

		Руб.	К.
1 АБОНЕМЕНТ	„Огонек" с „Библ. Романов" (36 №№ „Огонька" и 24 книги романов)—год 15 р. Допускается рассрочка: при подписке—4 р., к 1 марта—4 р. 50 к., к 1 мая—3 р. 50 к., к 1 июля—3 р.	15	—
2 АБОНЕМЕНТ	„Огонек" с „Библ. Огонек" (36 №№ „Огонька" и 72 книжки „Библ. Огонек")—новейшие произведения советских и иностранных писателей. На год—10 р., 6 мес.—5 р. 50 к., 3 мес.—3 р., 1 мес.—1 р.	10	—
3 АБОНЕМЕНТ	„Огонек" с „Библ. Романов" и „Библ. Огонек"—год—21 р. 50 к. Допускается рассрочка: при подписке—5 р., к 1 марта—4 р., к 1 мая—5 р., к 1 июля 4 р. 50 к. и к 1 сентября—3 р.	21	50
5 АБОНЕМЕНТ	„Огонек" с „Библ. Романов" и „Жен. Журналом" 12 №№ богато иллюстрир. журн. с прилож. к каждому номеру выкроечн. и контурн. листов и „Детск. Уголка". Год—24 р. 50 к. Допускается рассрочка: при подписке—6 р., к 1 марта—5 р. 50 к., к 1 мая—4 р. 50 к., к 1 июля—5 р. и к 1 сентября—3 р. 50 к.	24	50
ОГОНЕК	36 №№ в год. ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА ГОД—3 р. 25 к., 6 мес.—1 р. 75 к., на 3 мес.—90 к. и на 1 мес.—30 к.	3	25

7 БЕСПЛАТНЫХ ПРЕМИЙ Все годовые подписчики по I, III и V абонементам получат ПРЕМИЮ—4 МНОГОКРАСОЧНЫЕ ХУДОЖЕСТВЕННЫЕ КАРТИНЫ размером 40X50 см. стоимостью в 3 рубля. Подписчики по всем абонементам, внесшие до 1 января подписную плату ПОЛНОСТЬЮ, получают ДОПОЛНИТЕЛЬНО КОЛЕНКОРОВУЮ ПАПКУ С ЗОЛОТЫМ ТИСНЕНИЕМ для годового комплекта „Огонька" за 1930 год, а подписчики по V абонементу получают ДОПОЛНИТЕЛЬНО большую книгу „ДОМАШНИЕ РЕМЕСЛА" и комплект 10 книжек „БИБЛИОТЕКИ ОГОНЕК".

Подписка принимается: Издательством „Огонек"—Москва 6, Страстной бульвар, 11; всеми почтовыми предприятиями, письмоносцами, жел. дор. киосками Контрагентства печати, всеми местными уполномоченными „Гудка", всеми книжными отделениями потребит. кооперативов и всеми местными контрагентами.

ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ

У ВЫПАДКУ НЕАКУРАТНАЙ ДАСТАЎКІ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА" ванасце на тел. **2-49**

ЗЬВЯЗДА

ФОТО-ЦЫНКАГРАФІЯ ПРЫМАЕ ЗАКАЗЫ

НА КЛІШЭ

МАСТАЦКАЕ ВЫКАНАНЬНЕ РЭСУНКАЎ.

З ЗАКАЗАМІ ЗВАРОЧВАЦЦА У ГАЛОЎНУЮ КАНТОРУ ГАЗЭТЫ „ЗЬВЯЗДА"-МЕНСК, САВЕЦКАЯ, № 63, 3-ці паверх

ПАРТРЭТЫ, ГРАВЮРЫ, ПЛЯНЫ, СХЭМЫ, ФАКСІМІЛЕ, ЭТЫКЭТЫ, ЦЭНЬНІКІ, ВОКЛАДКІ, ВІНЬЕТКІ, РЭКЛЯМНЫЯ ПЛЯКАТЫ І ІНШЫЯ МАСТАЦКІЯ РАБОТЫ.

ПАСЬПЯШАЦЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА на СЬНЕЖАНЬ НА ГАЗЭТУ „ЗЬВЯЗДА"

орган ЦК і Мен. АК КП(б)Б.

УМОВЫ ПАДПІСКІ: на 1 м.—90к., на 3м.—2 р. 60к., на 6 м.—5 р., на 1 г.—9 р. 75к.

«Зьвязда» дае сваім падпісчыкам дадаткамі на льготных умовах часопісі

БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ	Рабоча-Крэсьтянскі КОРРЕСПОНДЕНТ	ОГОНЕК
1 м.—20 к. (замест 35 к.)	1 м.—25 к. (замест 30 к.)	1 м.—25 к. (замест 40 к.)

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА:

У Менску: Гал. к-рай гав. «Зьвязда», Савецкая, 63, ня уповноважанымі, газетным бюро і газетаносцамі.

Па акругах: Уповноважанымі газэты „Зьвязда", кіёскамі т-ва Друку і розмі паштова-тэлеграфнымі канторамі.

СВАЯЧАСОВАЯ здача падпіскі ГАРАНТУЕ АКУРАТНУЮ І БЕСЬПЕРАПЫННУЮ ДАСТАЎКУ ГАЗЭТЫ.

2 КВАТЭРЫ

2 пакоі 9 кв. с. (Ленінск. вул). і 1 пакой 4,75 кв. с. (Інтэрнац. вул.)

МЯНЯЕМ

на 1 кватэру з 3—4 пакояў. Адрас у канторы „Зьвязда".

**ЗАВОЧНЫЯ